Праваабарончы цэнтр «ВЯСНА»

# МАНІТОРЫНГ ВЫКАНАННЯ ПРАВА НА СПРАВЯДЛІВАЕ СУДОВАЕ РАЗБІРАЛЬНІЦТВА ПАДЧАС РАЗГЛЯДУ СПРАЎ АБ АДМІНІСТРАТЫЎНЫХ ПРАВАПАРУШЭННЯХ

*Вынікі даследавання, праведзенага ў дванаццаці судах Мінска, Брэста, Віцебска, Наваполацка і Полацка ў перыяд з 22 сакавіка па 2 красавіка 2004 года*

KAMUNIKAT.org

Мінск
2004

Human Rights Centre “Viasna”

# THE MONITORING OF REALIZATION OF THE RIGHT FOR FAIR COURT EXAMINATION DURING CONSIDERATION OF CASES ON ADMINISTRATIVE OFFENCES

*The results of the research conducted in twelve courts of Miensk, Bierascie, Viciebsk, Navapolacak and Polacak within the period from March 22 till April 2, 2004*

*The publishers express their thanks to the members of HELSINKI HUMAN RIGHTS FOUNDATION (Warsaw, Poland) for the provided methodical materials and consultations*

Выдаўцы выказваюць падзяку
ХЕЛЬСІНКСКАМУ ФОНДУ ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА
(Варшава, Польшча)
за ласкава прадастаўленыя метадычныя матэрыялы і кансультацыі,
а таксама ўсім удзельнікам групы па маніторынгу,
рэгіянальным каардынатарам і валанцёрам, без чыёй самаадданай працы
дадзенае даследаванне не было б рэалізавана.

Над выданнем працавалі:
Юрый Чавусаў, Уладзімір Лабковіч, Яўгенія Місілевіч, Алесь Кастыка
Пераклад: Андрэй Саротнік
Рэцэнзент: Барыс Звоскаў, выпускнік Вышэйшага міжнароднага курса па правах чалавека

Брашура падрыхтавана на базе Выканаўчага бюро Рабочай групы Асамблеі няўрадавых дэмакратычных арганізацый Беларусі

© Праваабарончы цэнтр «Вясна», 2004

ЗМЕСТ

**Уводзіны** . . . . . . . . . . . . . . . . 5

**1. Пастаноўка праблемы і мэты маніторынгу:** . . . . . . . . 6

апісанне сітуацыі з выкананнем права на справядлівае судовае разбіральніцтва падчас разгляду спраў аб адміністратыўных правапарушэннях . . . . . . 6

мэты маніторынгу і шляхі іх дасягнення . . . . . . 8

**2. Аналіз права і судовай практыкі:** . . . . . . . 11

заканадаўства пра разгляд спраў аб адміністратыўных правапарушэннях . . . . . . 11

практыка прыцягнення да адміністратыўнай адказнасці . . . . . . 19

**3. Метадалогія даследавання** . . . . . . . 28

стратэгія маніторынгу: даследчыцкія мэты і задачы . . . . . . 28

інструментарый: лісты назірання . . . . . . 34

**4. Дадзеныя, атрыманыя ў выніку даследавання** . . . . . . . 45

разгляд спраў аб адміністратыўных правапарушэннях . . . . . . 45

умовы працы судоў . . . . . . 82

**5. Агульныя высновы** . . . . . . . 92

**6. Рэкамендацыі па паляпшэнні становішча** . . . . . . . 97

рэкамендацыі дзяржаўным органам адносна практыкі разгляду спраў аб адміністратыўных правапарушэннях . . . . . . 97

рэкамендацыі Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь па ўвядзенні ў Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністратыўных правапарушэннях гарантый выканання права грамадзянаў на справядлівае судовае разбіральніцтва . . . . . . 100

Дадатак:

**Умовы ажыццяўлення праваабарончага маніторынгу ў беларускіх судах** . . . . . . . 105

**Рэзюме на англійскай мове** . . . . . . . 112

CONTENTS

Introduction . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5

1. **Raising of the problem and aims of the monitoring** . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6
   Description of the situation with realization of the right for fair and impartial examination during consideration of cases on administrative offences . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6
   Aims of the monitoring and ways of their achievement . . . . . . . . . . . . . . . . 8

2. **The analysis of the law and judicial practice** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11
   Legislation on consideration of administrative cases . . . . . . . . . . . . . . . . 11
   Practice of bringing to administrative account . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 19

3. **Methodology of the research** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 28
   Strategy of the monitoring: research aims and objectives . . . . . . . . . . . . . 28
   Tools: monitoring sheets. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 34

4. **Information received during research** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
   Investigation of cases on administrative offences. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
   conditions of court work . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 82

5. **General conclusion** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 92

6. **Recommendations on improvement of the current situation** . . . . . . . . . . . 97
   Recommendations for the state organs regarding the practice of administrative cases investigation . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97
   Recommendations for the National Assembly of the Republic of Belarus on introducing into the Proceeding and executive code on administrative offences (PECoAO) guarantees of realization of the citizens’ right for fair court assize . . . . . 100

Appendix:

Conditions of realization of human rights monitoring in Belarusan courts. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 105

Resume in the English language . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 112

# Уводзіны

*Адным з асноўных інстытутаў дэмакратычнага грамадства і прававой дзяржавы з'яўляецца справядлівы суд. Права на справядлівы суд належыць да фундаментальных правоў чалавека і замацавана ва Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. Згодна з Міжнародным пактам аб правах чалавека, кожны абвінавачаны мае права на справядлівы і публічны разгляд яго справы кампетэнтным і незалежным судом, створаным на падставе закону.*

*Разгляд беларускімі судамі спраў аб адміністратыўных правапарушэннях — недастаткова даследаваная галіна. Афіцыйная статыстыка дае няшмат інфармацыі пра стан рэчаў у гэтай сферы. У той жа час сотні тысяч беларускіх грамадзянаў штогод прыцягваюцца да адміністратыўнай адказнасці, штогод у судах краіны адбываецца каля трохсот тысяч пасяджэнняў па справах аб адміністратыўных правапарушэннях, на якіх прысуджаюцца пакаранні ў выглядзе арыштаў і вялікіх штрафаў. Аднак пытанні выканання правоў чалавека падчас гэтых працэсаў, у прыватнасці, права на справядлівы суд, застаюцца на перыферыі ўвагі грамадскасці.*

*Праваабарончыя арганізацыі шляхам маніторынгу павінны прыцягваць грамадскі інтарэс да гэтай праблемы і дамагацца паляпшэння становішча з выкананнем права на справядлівы суд. Адным з крокаў у гэтым накірунку з'яўляецца праграма маніторынгу выканання права на справядлівы суд, здзейсненая актывістамі Праваабарончага цэнтра «Вясна» ў перыяд з 22 сакавіка па 2 красавіка 2004 года. Дадзеная брашура з'яўляецца вынікам гэтай працы.*

*Аўтары спадзяюцца, што вынікі назірання за 533-ма адміністратыўнымі працэсамі ў дванаццаці судах пяці гарадоў краіны і распрацаваныя на іх падставе прапановы дадуць матэрыял, які будзе скарыстаны беларускімі судамі дзеля паляпшэння працы пры разглядзе спраў аб адміністратыўных правапарушэннях.*

*Таксама аўтары разлічваюць, што атрыманыя ў выніку маніторынгу дадзеныя стануць падмуркам для ўнясення ў праект Працэсуальнага кодэкса аб адміністратыўных правапарушэннях дадатковых гарантый выканання правоў чалавека. Некаторыя прапановы па замацаванні гэтых палажэнняў змешчаны ў дадзенай брашуры ў раздзеле «Рэкамендацыі па паляпшэнні становішча».*

*Вынікі гэтага даследавання павінны паспрыяць больш поўнаму выкананню правоў грамадзянаў і патрабаванняў закону падчас ажыццяўлення разгляду спраў аб адміністратыўных правапарушэннях.*

*Каардынатар праграмы маніторынгу*
*Юрый Чавусаў*

# 1. Пастаноўка праблемы і мэты маніторынгу

## Апісанне сітуацыі з выкананнем права на справядлівае судовае разбіральніцтва падчас разгляду спраў аб адміністратыўных правапарушэннях

Грамадскае аб'яднанне «Праваабарончы цэнтр «Вясна» мае грунтоўны вопыт назірання за адміністратыўнымі, крымінальнымі, грамадзянскімі працэсамі ў судах Беларусі. У штогадовых аглядах-хроніках парушэнняў правоў чалавека ў Беларусі, якія выдаюцца ПЦ «Вясна», неаднаразова адзначалася, што падчас судовых працэсаў парушаюцца асноўныя правы чалавека. Гэта адбываецца не толькі ў выніку парушэння судамі норм працэсуальнага заканадаўства, але таксама з-за недахопаў у самім заканадаўстве, якое часам не ўтрымлівае дастатковых гарантый для ажыццяўлення справядлівага судовага разгляду.

Парушэнні патрабаванняў закону і парушэнні права на справядлівае судовае разбіральніцтва асабліва характэрныя для адміністратыўных судовых працэсаў, у якіх вырашаюцца справы аб дробных правапарушэннях. Прадстаўнікі ПЦ «Вясна» штогод прымаюць удзел альбо назіраюць за сотнямі судовых пасяджэнняў па адміністратыўных правапарушэннях і фіксуюць падчас іх правядзення парушэнні права абвінавачанага на абарону, парушэнні тэрмінаў разгляду справы, незаконнае правядзенне таемных працэсаў, адначасовы разгляд у адным працэсе справы ў дачыненні да некалькіх правапарушальнікаў, парушэнні правілаў ацэнкі доказаў і недастатковую ўвагу да доказаў з боку абароны, парушэнні прэзумпцыі невінаватасці і інш. У выніку гэтага судовы разгляд адміністратыўных спраў вельмі часта з'яўляецца неаб'ектыўным і несправядлівым.

Часцей за ўсё ў гэтых справах не прымаюць удзел адвакаты, што таксама спрыяе парушэнням закону. Узровень пракурорскага нагляду за разглядам спраў аб адміністратыўных правапарушэннях застаецца вельмі нізкім: пракуроры даволі рэдка ўдзельнічаюць у судовых пасяджэннях па гэтай катэгорыі спраў. У Беларусі склалася заганная практыка, калі адміністратыўныя працэсы адбываюцца па спрошчанай працэдуры, не прадугледжанай заканадаўствам. Суддзі

збольшага ставяцца да гэтых спраў як да другарадных, што з'яўляецца недапушчальным. У выніку суды ніжэйшага ўзроўню не выконваюць патрабаванні працэсуальнага заканадаўства і парушаюць асноўныя правы абвінавачаных, у тым ліку права на справядлівае судовае разбіральніцтва, зафіксаванае ў Міжнародным пакце аб грамадзянскіх і палітычных правах і ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Пры гэтым пакаранне за здзяйсненне адміністратыўнага правапарушэння можа складаць да 15 сутак адміністратыўнага арышту, таксама прадугледжаны велізарныя штрафы памерам да некалькіх тысяч долараў. Парадаксальна, але штрафныя санкцыі за адміністратыўнае правапарушэнне могуць перавышаць памер штрафу за некаторыя крымінальныя злачынствы ажно ў дзесяць разоў. Гэта азначае, што адміністратыўная адказнасць з'яўляецца дастаткова сур'ёзным сродкам прававога ўздзеяння, звязаным з істотным абмежаваннем правоў. Таму прыцягненне да гэтага віду адказнасці мусіць адбывацца ў адпаведнасці з законам і толькі ў межах справядлівай працэдуры. У тым ліку гэта датычыцца і тых выпадкаў, калі адміністратыўныя справы разглядаюцца судом.

За сем год дзейнасці грамадскай прыёмнай ПЦ «Вясна» да юрыстаў арганізацыі звярнуліся сотні грамадзянаў, якія скардзіліся на парушэнне іх правоў падчас разгляду адміністратыўных спраў. Штогод юрысты ПЦ «Вясна» складаюць дзесяткі скаргаў у вышэйстаячыя суды на рашэнні па адміністратыўных справах — шмат якія з гэтых скаргаў задаволеныя вышэйстаячымі судамі.

Сітуацыя пагаршаецца тым, што пастановы судоў па адміністратыўных справах набываюць моц адразу пасля іх абвяшчэння — яны не падлягаюць касацыйнаму альбо апеляцыйнаму перагляду. Падача нагляднай скаргі можа стаць падставай для перагляду справы толькі пры наяўнасці бясспрэчнага юрыдычнага абгрунтавання — напісанне такой скаргі не абавязкова цягне за сабой спыненне выканання рашэння і перагляд справы. Такім чынам, грамадзяне Беларусі пазбаўлены эфектыўнага сродку прававой абароны ад парушэння іх правоў падчас адміністратыўных працэсаў.

Яшчэ адной умовай, якую трэба ўлічваць пры ацэнцы выканання працэсуальных патрабаванняў падчас разгляду спраў аб адміністратыўных правапарушэннях, з'яўляюцца кепскія матэрыяльна-тэхнічныя ўмовы працы судоў. Кепскае забеспячэнне судоў і недастат-

ковая ўвага судовай адміністрацыі да пытанняў належнай працы па адміністрацыйных матэрыялах часта пазбаўляюць грамадзянаў магчымасці абараніць свае правы. У прыватнасці, адсутнасць доступу ў суды для інвалідаў, адсутнасць у будынках суда дастатковай інфармацыі пра расклад працы суддзяў, пошук адвакатаў і іншых неабходных звестак, адсутнасць элементарных умоў для працы грамадскага будынка (агульнадаступных гардэробаў і прыбіральняў, буфетаў альбо кавярняў, магчымасцяў паркоўкі аўтамабіляў), неабгрунтаваныя абмежаванні ў доступе да судовых пакояў, нястача неабходнага абсталявання ствараюць перашкоды грамадзянам у доступе да суда.

Вынікам уздзеяння ўсіх адзначаных фактараў з'яўляецца тое, што падчас разгляду адміністратыўных спраў суды Беларусі стала і сістэматычна парушаюць нормы працэсуальнага заканадаўства і права грамадзянаў Беларусі на справядлівае і адкрытае судовае разбіральніцтва.

## Мэты маніторынгу і шляхі іх дасягнення

ПЦ «Вясна» неаднаразова звяртаў увагу дзяржаўных органаў на парушэнні, што дапускаюць суды падчас разгляду адміністратыўных спраў, выказваў пратэст адносна практыкі, якая склалася ў судах краіны пры іх разглядзе. Аднак дзяржаўныя органы і прадстаўнікі судовай сістэмы не прызнаюць наяўнасць гэтай праблемы. На іх думку, нават калі закон і парушаецца падчас разгляду асобных спраў, у цэлым судаводства па адміністратыўных справах адбываецца без парушэнняў і адпавядае міжнародным нормам у галіне правоў чалавека. Афіцыйная статыстыка не фіксуе парушэнняў правоў чалавека падчас судовых працэсаў і ўвогуле надае мала ўвагі справам аб адміністратыўных правапарушэннях.

Такім чынам, каб давесці да дзяржаўных органаў наяўнасць пазначанай праблемы і патрабаваць змянення сітуацыі, было вырашана правесці сістэмны маніторынг разгляду беларускімі судамі спраў аб адміністратыўных правапарушэннях і дакладна зафіксаваць маштабы парушэнняў, прынамсі, у межах асобных судоў. У якасці аб'екта маніторынгу былі абраныя 12 судоў Мінска, Брэста, Віцебска, Полацка, Наваполацка. Яны з'яўляюцца дастаткова рэпрэзентацыйнымі, прадстаўляюць сталіцу, абласныя цэнтры, гарады раённага падпарадкавання і вясковыя тэрыторыі (раёны).

Наяўнасць вынікаў маніторынгу, у якіх дакладна зафіксаваныя маштабы парушэнняў правоў чалавека падчас разгляду спраў аб адміністратыўных правапарушэннях, дазваляе звярнуцца ў судовыя органы з прапановамі аб змяненні судовай практыкі. Гэтыя змены мусяць быць скіраваныя на выкананне права абвінавачанага на справядлівы разгляд яго справы ў межах аб'ектыўнага і ўсебаковага працэсу і вызначанай у законе судовай працэдуры. Судаводства павінна адбывацца з поўным выкананнем правоў грамадзянаў на абарону, на прадастаўленне доказаў на сваю карысць, з дакладным інфармаваннем грамадзянаў пра іх правы ў межах адміністратыўнага працэсу. Таксама існуе неабходнасць паляпшэння доступу грамадзянаў да суда, павышэння культуры працы суддзяў і стварэння спрыяльных матэрыяльна-тэхнічных умоў для ажыццяўлення правасуддзя.

Акрамя таго, зараз у беларускім Парламенце разглядаецца праект новага Працэсуальна-выканаўчага кодэкса аб адміністратыўных правапарушэннях, які будзе цалкам рэгуляваць усе пытанні прыцягнення грамадзянаў да адміністратыўнай адказнасці, у тым ліку працэдуру судовага разгляду адміністратыўных матэрыялаў. Гэты фактар стаў дадатковым штуршком для рэалізацыі дадзенага даследавання, паколькі з'явілася магчымасць паўплываць на змяненне ўмоў разгляду спраў аб адміністратыўных правапарушэннях у беларускіх судах праз прапановы да зместу новага адміністратыўна-працэсуальнага заканадаўства.

Наяўнасць вынікаў маніторынгу з зафіксаванымі маштабамі парушэнняў правоў грамадзянаў і дадзенымі пра адхіленні ад устаноўленай працэдуры разгляду адміністратыўных правапарушэнняў дазваляе патрабаваць унясення ў гэты законапраект норм, якія б прадухілілі парушэнні правоў грамадзянаў падчас разгляду адміністратыўных спраў, сталі б гарантыяй выканання права на справядлівы суд.

Аб'ектам даследавання, якое ладзілася ў межах маніторынгу, было выкананне працэсуальных правоў грамадзянаў, а таксама тыя праблемы, што маюць месца ў арганізацыі і ўмовах працы раённых судоў. Пры гэтым у мэты маніторынгу не ўваходзіла ацэнка сутнасці рашэнняў, што прымаліся судамі па выніках разгляду спраў, — увага была скіраваная толькі на працэсуальны момант.

***Мэта маніторынгу была вызначана наступным чынам:***

*правесці аналіз выканання права на справядлівае судовае разбіральніцтва падчас разгляду спраў аб адміністратыўных правапарушэннях і ўнесці прапановы па прывядзенні працэсуальнага заканадаўства і судовай практыкі ў адпаведнасць са стандартамі правоў чалавека.*

***У межах дадзенай мэты былі вызначаны наступныя аператыўныя задачы маніторынгу:***

- *ажыццявіць назіранне за выкананнем права на справядлівае судовае разбіральніцтва падчас судовых працэсаў па адміністратыўных справах у дванаццаці судах базавага ўзроўню Мінска, Брэста, Віцебска, Полацка, Наваполацка;*
- *давесці вынікі праведзенага маніторынгу да ведама прэсы, грамадскасці і суддзяў;*
- *распрацаваць па выніках маніторынгу рэкамендацыі па ўнясенні змен у заканадаўства і выпраўленні судовай практыкі, перадаць гэтыя рэкамендацыі адпаведна ў Парламент Рэспублікі Беларусь і ў суды.*

KAMUNIKAT.org

# 2. Аналіз права і судовай практыкі

Згодна з афіцыйнай статыстыкай, якую распаўсюджвае Міністэрства ўнутраных спраў, штогод у Беларусі фіксуецца да пяці мільёнаў адміністратыўных правапарушэнняў, і гэтая лічба мае ўстойлівую тэндэнцыю да павелічэння. Гэта значыць, што прыкладна кожны другі жыхар нашай краіны здзяйсняе цягам года адміністратыўнае правапарушэнне. Сярод найбольш распаўсюджаных відаў адміністратыўных правапарушэнняў — кіраванне аўтатранспартам у нецвярозым стане, распіццё спіртовых напояў у грамадскім месцы альбо з'яўленне ў грамадскіх месцах у нецвярозым стане, парушэнне правілаў гандлю і аказання паслуг насельніцтву, гандаль у нявызнааных месцах, дробнае хуліганства, дробны крадзёж. Па кожным з гэтых відаў правапарушэнняў штогод прыцягваецца да адміністратыўнай адказнасці (а гэта значыць штрафы, арышты на тэрмін да 15 сутак) больш за дзесяць тысяч чалавек.

### Заканадаўства пра разгляд спраў аб адміністратыўных правапарушэннях

Прычына таго, што так відавочна павялічваецца колькасць правапарушэнняў, палягае зусім не ў росквіце антыправавых настрояў насельніцтва. Справа ў тым, што наша адміністратыўнае заканадаўства маральна састарэла і не адпавядае сённяшнім палітычна-прававым рэаліям. Кодэкс аб адміністратыўных правапарушэннях (КаАП) — асноўны заканадаўчы акт у гэтай сферы — быў прыняты яшчэ ў 1984 годзе і, адпаведна, адлюстроўвае тагачасную рэчаіснасць. Дастаткова сказаць, што калі цяпер суддзі вызначаюць пакаранне згодна з дзейным Кодэксам аб адміністратыўных правапарушэннях, яны, у адпаведнасці з артыкулам 1 згаданага Кодэкса, робяць гэта ў мэтах *«охраны общественного строя СССР, социалистической собственности, укрепления социалистической законности и воспитания граждан в духе точного и беспрекословного исполнения Конституции СССР и в духе уважения к правилам социалистической жизни»*. Натуральна, што ў такім выпадку любы працэс ператвараецца ў прафанацыю — дастаткова толькі каму-небудзь

з правапарушальнікаў па-сапраўднаму задумацца, на падставе чаго і з якой мэтай яго прыцягваюць да адказнасці.

Гэтая праблема наспела ўжо даволі даўно, але вырашэнне яе доўгі час абмяжоўвалася паўмерамі. Агульнавядома, што ў дзейны КаАП за часы глыбокіх пераўтварэнняў у нашым грамадстве (у асноўным у 90-я гады) было ўнесена каля 200 змен, якія шмат у чым набліжалі яго да сучаснасці і рабілі адпаведным духу правоў чалавека. Змяненні і дапаўненні ўносяцца ў КаАП кожнай чарговай сесіяй Парламента, практычна кожны артыкул КаАП заканчваецца заўвагай пра ўнесеныя ў яго змены. У выніку КаАП набыў выгляд дзіўнага кентаўра, складзенага з норм сацыялістычнай законнасці, але дапоўненага элементамі, прыстасаванымі да сучаснай прававой сістэмы Беларусі. Спробы Вярхоўнага суда і Канстытуцыйнага суда вырашыць пытанне састарэласці КаАП на ўзроўні яго выкарыстання судамі не прывялі да якаснага змянення сітуацыі.

Таму, напэўна, будзе слушнай выснова пра тое, што дзейны КаАП — самы архаічны з кодэксаў у нашым заканадаўстве. Усе іншыя сферы грамадскага жыцця ўжо рэгулююцца новымі кодэксамі, прынятымі ў адпаведнасці з канцэпцыяй судова-прававой рэформы. Новыя Крымінальны, Крымінальна-працэсуальны, Грамадзянскі, Грамадзянска-працэсуальны, Гаспадарча-працэсуальны, Жыллёвы, Шлюбна-сямейны, Мытны і іншыя кодэксы згодна з патрабаваннямі рэчаіснасці адпаведныя галіны права давялі да ладу. І хоць шмат якія прагрэсіўныя нормы не трапілі ў гэтыя кодэксы — напрыклад, суд прысяжных па крымінальных справах быў прадугледжаны ў новым Крымінальна-працэсуальным кодэксе, але Прэзідэнт адмовіўся падпісваць адпаведныя артыкулы, і таму яны не набылі моц, а пасля ўвогуле былі выключаны з Кодэкса, — у цэлым заканатворчая праца прынесла плён, і яе трэба занесці ў актыў Парламента і Нацыянальнага цэнтра законапраектнай дзейнасці.

Надышла чарга ўдасканалення і адміністратыўна-прававой галіны.

З 1995 года вялася праца над двума новымі кодэксамі, якія павінны замяніць КаАП 1984 года. 2 красавіка 2002 года Саветам Рэспублікі быў зацверджаны Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях — у ім вызначаны прыкметы ўсіх правапарушэнняў і замацаваны агульныя нормы, што датычацца ўсіх правапарушэнняў.

Асобным Працэсуальна-выканаўчым кодэксам аб адміністрацыйных правапарушэннях будуць вызначаны: парадак вядзення адміністрацыйных спраў, правы ўдзельнікаў адміністрацыйнага працэсу, парадак выканання пастаноў аб адміністрацыйным спагнанні. Такім чынам, заканадаўцы збіраюцца падзяліць матэрыяльную і працэсуальную часткі гэтай галіны заканадаўства (як гэта цяпер існуе ў крымінальнай галіне), адначасова наблізіўшы яе да сучаснага жыцця.

Верагодна, на адной з наступных сесій Парламента будзе зацверджаны Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях (ПВКаАП), які будзе вызначаць працэдуру прыцягнення да адміністратыўнай адказнасці, правы і абавязкі ўдзельнікаў адміністратыўнага працэсу, органы, што будуць разглядаць справы аб адміністратыўных правапарушэннях, а таксама рэгуляваць выкананне адміністратыўных спагнанняў. Трэба адзначыць, што на дадзены момант, перад трэцім чытаннем, ПВКаАП вельмі змяніўся ў параўнанні з тым тэкстам, які быў прапанаваны да разгляду Прэзідэнтам (праекты новых кодэксаў у Парламент традыцыйна ўносіць кіраўнік дзяржавы).

Агульнай якасцю двух новых кодэксаў (ужо прынятага, але не ўведзенага ў дзеянне КаАП і ПВКаАП, які рыхтуецца) з’яўляецца тое, што заканадаўства робіцца больш актуальным, болей адпавядае сучаснаму жыццю. Шмат якія рудыменты савецкай прававой сістэмы знікаюць з абноўленага заканадаўства. Адначасова адміністратыўная галіна шмат у чым робіцца падобнай да крымінальнага заканадаўства — гэтыя дзве галіны права цяпер фармуюцца ў адным ключы, зыходзячы з агульных прынцыпаў.

## Кодэкс аб адміністратыўных правапарушэннях 2003 года

Нягледзячы на тое, што новы КаАП ужо прайшоў усю працэдуру ў заканадаўчым працэсе — быў зацверджаны ў канчатковым выглядзе Палатай прадстаўнікоў у снежні 2002 года і Саветам Рэспублікі ў красавіку 2003 года, а таксама падпісаны Прэзідэнтам, — пакуль што ён не набыў моц. Пра гэта гаворыць апошні раздзел новага КаАП, які вызначае, што новы кодэкс уводзіцца ў дзеянне спецыяльным законам. Такім чынам, цяпер ідзе перападрыхтоўка праваахоўных органаў і судоў, іх супрацоўнікі вывучаюць новы КаАП, рыхтуюцца да яго ўвядзення. Трэба чакаць, што закон аб увядзенні ў

дзеянне новага КаАП будзе прыняты пасля таго, як Парламент канчаткова прыме, а Прэзідэнт падпіша Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях — гэтыя два кодэксы цесна звязаныя, і іх увядзенне паасобку не мае сэнсу.

Паспрабуем зараз крыху прааналізаваць фактычна выніковы варыянт працы нашых заканатворцаў. КаАП 2003 года з'яўляецца новым як па форме, так і па змесце. У адрозненне ад старога КаАП, новы не ўтрымлівае норм працэсуальнага характару, не рэгулюе працэдуру прыцягнення да адміністратыўнай адказнасці (гэта сфера дзеяння ПВКаАП), а толькі вызначае падставы і ўмовы адміністратыўнай адказнасці. Ён таксама вызначае, якія дзеянні з'яўляюцца правапарушэннем, апісвае склад адпаведных правапарушэнняў (то бок пералічвае іх прыкметы), устанаўлівае віды адміністратыўных спагнанняў, а таксама вызначае, у якім памеры і якога віду адміністратыўнае спагнанне можа быць прызначана за здзяйсненне правапарушэння па кожным канкрэтным артыкуле ў выпадку прызнання суб'екта (юрыдычнай альбо фізічнай асобы, якая дасягнула ўзросту адказнасці) вінаватым у здзяйсненні дадзенага правапарушэння.

Тым часам, хаця КаАП яшчэ не набыў моц, у яго ўжо ўносяцца змены. Напрыклад, раздзел 12 «адміністратыўныя правапарушэнні ў галіне прадпрымальніцкай дзейнасці» атрымаў дзевяць новых артыкулаў, яшчэ ў тры артыкулы былі ўнесеныя змены, і нават у некаторыя з тых дзевяці новых артыкулаў унеслі дадатковыя змены. Такім чынам, за некалькі месяцаў пасля прыняцця Парламентам новага Кодэкса была перапісаная амаль палова гэтага вельмі істотнага раздзела. І справа тут зусім не ў патрэбе актуалізаваць Кодэкс у сувязі з нейкімі карэннымі трансфармацыямі ў прадпрымальніцкім праве. Такая нестабільнасць у вялікай ступені звязана з першапачатковай заганнасцю нашай прававой сістэмы — увесь час з'яўляюцца новыя акты Прэзідэнта, указы і дэкрэты наконт змянення падстаў і памераў адміністратыўнай адказнасці, перманентна ідзе працэс вызначэння новых штрафных санкцый. А ў нашай прававой сістэме дэкрэт мае больш высокую юрыдычную моц, чым кодэкс — таму і даводзіцца яго змяняць і дапаўняць. Такім чынам, толькі што прыняты свежы Кодэкс імгненна страціў адпаведнасць прэзідэнцкім актам і запатрабаваў далейшых змен. Відавочна, што такая нестабільнасць заканадаўства не спрые ўмацаванню законнасці ў нашай дзяржаве. Яна сведчыць пра непрадказальнасць нашага заканадаўства — немагчы-

ма спрагназаваць, ці не будзе праз некалькі месяцаў супрацьзаконным цалкам законнае ў дадзены момант дзеянне. Робячы бяскрыўдную справу, чалавек не можа быць упэўненым, што ён не парушае пры гэтым закон, як гэта было, напрыклад, з ужываннем наяўнай замежнай валюты для пазык альбо разлікаў паміж грамадзянамі.

Вельмі цікава тое, што згодна з новым КаАП да суб’ектаў адміністратыўнага правапарушэння будуць адносіць і юрыдычных асоб — гэта прынцыповым чынам мяняе сістэму прыцягнення да адміністратыўнай адказнасці. Цяпер правапарушальнікам можа быць і камерцыйная фірма, і дзяржаўная ўстанова, і грамадскае аб’яднанне. Напэўна, такая змена з’яўляецца слушнай, паколькі шмат якія парушэнні права здзяйсняюцца менавіта юрыдычнымі асобамі (арганізацыямі). Цяпер на іх у вызначаных КаАП выпадках будуць накладацца штрафы. Раней за такія парушэнні адказнасць неслі альбо службовыя асобы гэтых арганізацый, альбо ўвогуле ніхто. Аднак тут можна прагназаваць шмат праблем у вызначэнні віны юрыдычнай асобы, аддзяленні ў правапарушэнні віны супрацоўнікаў арганізацыі ад віны арганізацыі ў цэлым.

Прынцыповай якасцю новага КаАП з’яўляецца тое, што адміністратыўная адказнасць можа быць вызначана толькі згодна з гэтым кодэксам. Гэта значыць, што ўсе акты заканадаўства, якія прадугледжваюць адміністратыўную адказнасць, павінны падлягаць інкарпарацыі ў новы кодэкс, альбо ў новым кодэксе мусіць быць прадугледжана адпаведная бланкетная норма, якая будзе спасылацца на іншы акт заканадаўства (падзаконны акт мясцовай улады, указ альбо дэкрэт). І памер адміністратыўнага спагнання будзе вызначацца толькі ў адпаведнасці з артыкулам новага Кодэкса аб адміністратыўных правапарушэннях. Такім чынам, пасля набыцця моцы новым КаАП будзе немагчымай сітуацыя, калі правапарушальнік прыцягваецца да адміністратыўнай адказнасці на падставе нейкага акту падзаконнага характару без адназначнай спасылкі на спецыяльны артыкул КаАП, як гэта адбываецца зараз.

Важным змяненнем беларускага заканадаўства аб адміністратыўных правапарушэннях з’яўляецца ўвядзенне паняццяў няскончанага правапарушэння, замаху на правапарушэнне, а таксама саўдзелу ў здзяйсненні правапарушэння.

Аналізуючы новы КаАП, трэба таксама адзначыць некалькі прынцыповых момантаў, што датычацца вызначэння відаў і памераў

адміністратыўных спагнанняў. Уводзіцца толькі адзін новы від адміністратыўнага спагнання — пазбаўленне права займацца вызначанай дзейнасцю, што па сутнасці з’яўляецца пазбаўленнем ліцэнзіі альбо спецыяльнага дазволу займацца пэўным відам дзейнасці на тэрмін ад шасці месяцаў да аднаго года.

Толькі пазітыўна можна разглядаць тыя змены, што датычацца максімальнага памеру адміністратыўнага штрафу. Калі згодна з ранейшым КаАП з грамадзянаў можна было спагнаць да трохсот базавых адзінак, а са службовых асоб — да пяцісот, то цяпер памер максімальнага штрафу для фізічных асоб па агульным палажэнні складае 50 базавых адзінак. Гэта дазволіць пазбегнуць парадаксальных сітуацый, якія часта здараліся раней, калі штраф за адміністратыўнае правапарушэнне мог быць нашмат большым, чым штраф за крымінальнае злачынства. Але заканадаўцы ўвялі вялікую колькасць выключэнняў са згаданага агульнага правіла, калі штраф у дачыненні фізічнай асобы можа дасягаць трохсот базавых адзінак. Для індывідуальных прадпрымальнікаў максімальны штраф можа дасягаць двухсот базавых адзінак, а для юрыдычных асоб — тысячы базавых адзінак. Штраф устаноўлены ў якасці меры пакарання практычна за ўсе віды адміністратыўных правапарушэнняў.

Адбыліся некаторыя змены і ў парадку накладання адміністратыўнага спагнання ў выглядзе адміністратыўнага арышту. Па-ранейшаму максімальны тэрмін арышту за адно правапарушэнне не можа перавышаць 15 сутак. Аднак, у адрозненне ад старога КаАП, кожны канкрэтны артыкул не звужае прастору для выкарыстання арышту. Калі раней шмат якія артыкулы казалі пра арышт, напрыклад, «ад 3-х да 10-ці сутак» альбо «да 5-ці сутак», то цяпер артыкулы КаАП папросту кажуць «арышт», а суд самастойна вызначае прамежак часу (але не болей за 15 сутак), які чалавек будзе вымушаны правесці пад вартай.

Нельга прызнаць пазітыўнай зменай абмежаванне агульнага памеру арышту 25-цю суткамі пры адначасовым разглядзе некалькіх парушэнняў, здзейсненых адной асобай. Такім чынам, адміністратыўныя арышты за розныя правапарушэнні будуць падсумоўвацца ў межах 25-ці сутак — у старым КаАП дзейнічала правіла, што нават за некалькі парушэнняў чалавек не можа быць арыштаваны болей чым на 15 сутак. Такім чынам, максімальная

працягласць адміністратыўнага арышту цяпер будзе рэальна складаць 25 сутак.

Захаваліся старыя па сутнасці віды адміністратыўных спагнанняў — папярэджанне, канфіскацыя, пазбаўленне спецыяльнага права (напрыклад, права кіраваць аўтатранспартам), спагнанне кошту прадмета правапарушэння (напрыклад, скрадзенай рэчы пры дробным крадзяжы). Аднак з’явіліся і новыя віды спагнанняў — пазбаўленне права займацца пэўнай дзейнасцю і дэпартацыя. Пры гэтым дэпартацыя прадугледжана за некаторыя правапарушэнні для грамадзянаў замежных краін і асоб без грамадзянства — у тым ліку і за парушэнне парадку прадастаўлення і выкарыстання замежнай бязвыплатнай дапамогі.

Што датычыцца змен у складзе асобных відаў правапарушэнняў і змянення санкцый за іх здзяйсненне, то тут унесена даволі шмат новага — аналіз гэтых змен патрабуе асобнага грунтоўнага вывучэння. Напрыклад, з’явілася некалькі артыкулаў, звязаных з выкарыстаннем шыфравальных сістэм для абароны інфармацыі кшталту PGP (арт. 22.7 – 22.8 КаАП), устаноўлена адміністратыўная адказнасць за паленне (спажыванне) тытунёвых вырабаў у забароненых месцах (арт. 17.9 КаАП) і г. д.

Цікава, што цяпер адказнасць за непадпарадкаванне законным патрабаванням міліцыі пашырылася — грамадзяне будуць несці адказнасць за непадпарадкаванне законным патрабаванням усіх службовых асоб пры выкананні імі службовых абавязкаў (арт. 23.4 КаАП). Без змен застаўся ў КаАП і такі рудымент савецкага жыцця, як адказнасць за пражыванне без прапіскі.

Па-ранейшаму КаАП утрымлівае шмат бланкетных норм, што адсылаюць да іншых нарматыўна-прававых актаў, у асноўным падзаконнага характару. Напрыклад, каб даведацца, ці не парушыў чалавек арт. 23.43 КаАП «Парушэнне заканадаўства пра пахаванне», трэба ведаць гэтае заканадаўства. Такім чынам, даволі шмат артыкулаў знаходзяцца ў залежнасці ад іншых законаў, дэкрэтаў, указаў і падзаконных актаў. З прававога пункту гледжання пашыранае выкарыстанне бланкетных норм не супярэчыць згаданаму вышэй палажэнню пра тое, што КаАП з’яўляецца адзіным законам, які вызначае адміністратыўную адказнасць. Аднак відавочна, што гэта ўскладняе разуменне таго, якія дзеянні з’яўляюцца адміністратыўным правапарушэннем.

## Праект Працэсуальна-выканаўчага кодэкса аб адміністратыўных правапарушэннях

Нельга не адзначыць, што наяўнасць спецыяльнага ПВКаАП будзе, безумоўна, спрыяльным фактарам для выканання правоў грамадзянаў — ён відавочна лепей гарантуе правы ўдзельнікаў адміністратыўнага працэсу. Але таксама відавочна, што шмат у гэтым пытанні будзе залежаць ад пазіцыі праваахоўных органаў і судоў, ад таго, наколькі прынцыпова яны будуць выконваць новыя правілы.

Аналіз ПВКаАП ускладняецца тым, што пакуль гэты кодэкс існуе толькі ў якасці праекта, які яшчэ не набыў канчатковага выгляду. Аднак напярэдадні трэцяга чытання варта адзначыць некаторыя прынцыповыя моманты новага кодэкса.

ПВКаАП з'яўляецца адзіным законам, які рэгулюе судаводства па справах аб адміністратыўных правапарушэннях. Ён заснаваны на дзейнай Канстытуцыі і агульнапрынятых прынцыпах міжнароднага права, адпавядае палітыка-прававой рэчаіснасці ў Беларусі.

У параўнанні з ранейшым заканадаўствам, правы і абавязкі ўсіх удзельнікаў працэсу на розных яго стадыях вызначаны больш дакладна. Усе працэсуальныя дзеянні і пытанні знайшлі сваё адлюстраванне ў новым кодэксе. Адначасова павялічыліся паўнамоцтвы судоў у разглядзе адміністратыўных спраў: колькасць артыкулаў, справы па якіх разглядаюцца суддзямі, павялічылася. Таксама права разглядаць адміністратыўныя правапарушэнні нададзена суддзям гаспадарчых судоў. ПВКаАП падрабязна рэгулюе парадак выканання пастаноў аб адміністратыўных правапарушэннях.

Такім чынам, сама наяўнасць кодэкса, які спецыяльна рэгулюе судаводства па адміністратыўных справах, павінна пазітыўна адбіцца на ўзроўні законнасці падчас гэтых працэсаў. Цяпер у Беларусі з'явіцца акт заканадаўства, які будзе дакладна вызначаць парадак разгляду адміністратыўных спраў, ліквідуе сённяшнюю сітуацыю прававой неўрэгуляванасці.

Застаецца спадзявацца, што, прымаючы ў апошнім трэцім чытанні Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністратыўных правапарушэннях, парламентарыі прадэманструюць адказнасць. Гэты нарматыўна-прававы акт датычыцца вельмі важнай для простых грамадзянаў галіны заканадаўства, ён павінен не проста запоўніць прабел у праве (а дзеючы стары КаАП з-за сваёй састарэласці мае ме-

навіта такую якасць), а стварыць умовы для выканання правоў грамадзянаў на справядлівае разбіральніцтва адміністрацыйных справаў, прадухіліць парушэнні правоў грамадзянаў. Напярэдадні блізкіх выбараў у Палату прадстаўнікоў такі крок дэпутатаў мусіць атрымаць належную ацэнку з боку выбаршчыкаў, паколькі адміністрацыйнае судаводства датычыцца літаральна кожнага.

## Судовая практыка прыцягнення да адміністратыўнай адказнасці

На сённяшні дзень у краіне функцыянуюць 144 раённыя (гарадскія) суды. Менавіта гэтыя суды базавага ўзроўню з'яўляюцца тымі органамі, якія ажыццяўляюць разгляд справаў аб адміністратыўных правапарушэннях. Вялікая колькасць адміністратыўных справаў стварыла сітуацыю, калі разам з агульнымі суддзямі ў судах базавага ўзроўню працуюць і спецыяльныя суддзі па адміністратыўных справах і выканаўчым судаводстве. Менавіта гэтая катэгорыя суддзяў і разглядае асноўную частку справаў аб адміністратыўных правапарушэннях. Пры гэтым пэўная частка адміністратыўных справаў разглядаецца і агульнымі суддзямі — парадак размеркавання судовых справаў вызначаецца кіраўніком канкрэтнага суда.

У 2002 годзе ў суды Рэспублікі Беларусі трапіла 288871 адміністратыўная справа. Такім чынам, у параўнанні з 2001 годам колькасць адміністратыўных справаў павялічылася на 5136 справаў, альбо на 1,8%. Колькасць справаў, разгледжаных судамі г. Мінска, скарацілася на 25,2%, Гродзенскай вобласці — на 7,6%, Магілёўскай вобласці — на 6,1%, Мінскай вобласці — на 5,4%. Адначасова павялічылася колькасць справаў, што былі разгледжаныя судамі Віцебскай вобласці — на 3,3%, Гомельскай вобласці — на 0,7%, Брэсцкай вобласці — на 3,7%.

У 2002 годзе 72166 правапарушальнікаў былі асуджаныя да штрафу, у дачыненні да 8290 былі выкарыстаны выпраўленчыя работы, 69331 былі асуджаныя да адміністратыўнага арышту на тэрмін ад 1 да 15 сутак. Агульная сума штрафу, накладзенага ў якасці меры адміністратыўнага спагнання, склала 4678300 тысяч рублёў, з якіх у 2002 годзе было рэальна спагнана толькі 2189259 тысяч рублёў, што складае 46,8% ад агульнай сумы накладзеных штрафаў. Аднак з улікам штрафаў, прызначаных у папярэднія гады, агульная сума спагнаных у даход дзяржавы грошай склала 5896161 тысячу рублёў.

На 1 снежня 2003 года ў судах краіны працавалі 174 суддзі па адміністратыўных справах і выканаўчым судаводстве. Згодна з дадзенымі, распаўсюджанымі часопісам «Юстыцыя Беларусі» (2003, № 3), у 2002 годзе сярэднямесячная нагрузка на аднаго суддзю па адміністратыўных справах і выканаўчым судаводстве склала 142 адміністратыўныя справы і практычна не змянілася ў параўнанні з 2001 годам. Аднак пры аналізе гэтых дадзеных трэба ўлічваць, што на сённяшні дзень шэраг судоў адмовіўся ад асобных пасад адміністратыўных суддзяў — у гэтых судах адміністратыўныя матэрыялы трапляюць альбо да розных суддзяў па чарзе, альбо да дзяжурнага суддзі, альбо папросту да таго суддзі, які ў дадзены момант з'яўляецца найменш загружаным. Такім чынам, рэальная загружанасць адміністратыўных суддзяў з'яўляецца меншай, чым адзначае афіцыйная статыстыка.

*Статыстычныя дадзеныя аб разглядзе адміністратыўных спраў судамі Рэспублікі Беларусь за 2002 год*

| **Вобласць** | **Разгледжана адміністрацыйных спраў** | **Накладзена адміністрацыйных спагнанняў** | **З іх** | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | **штраф** | **выпраўленчыя работы** | **арышт** | **іншае** |
| Брэсцкая | 43579 | 36424 | 22626 | 838 | 9940 | 3020 |
| Віцебская | 38525 | 32782 | 21889 | 1421 | 8069 | 1403 |
| Гомельская | 48749 | 43432 | 29048 | 1331 | 11016 | 2037 |
| Гродзенская | 32894 | 26274 | 15241 | 1241 | 8456 | 1336 |
| Мінская | 51026 | 45174 | 29642 | 2172 | 12554 | 806 |
| г. Мінск | 30486 | 24904 | 18704 | 46 | 4809 | 1345 |
| Магілёўская | 43612 | 35622 | 17527 | 1241 | 14487 | 2367 |
| **Агулам** | 288871 | 244612 | 154677 | 8290 | 69331 | 12314 |

У 2003 годзе тэндэнцыя да павелічэння колькасці адміністратыўных спраў у судах рэспублікі захавалася. Пры гэтым кіраўніцтва судоў працягнула практыку пераводу суддзяў з пасады суддзі па адміністрацыйных справах і выканаўчым судаводстве на пасаду суддзі агульнага суда — напрыклад, толькі ў першым паўгоддзі

2003 года такая працэдура была здзейснена ў дачыненні да 11 суддзяў. Такім чынам, нягледзячы на агульнае павелічэнне колькасці суддзяў, якія працуюць у судах Беларусі, колькасць суддзяў, што працуюць на спецыяльнай пасадзе суддзі па адміністрацыйных справах і выканаўчым судаводстве, скарацілася. З улікам павелічэння колькасці адміністрацыйных спраў гэта азначае, што рэальна адміністрацыйныя справы ўсё часцей і часцей разглядаюцца суддзямі агульнага статусу.

У 2003 годзе судамі краіны разгледжана 328258 адміністратыўных спраў, што на 39387 адміністратыўных спраў болей, чым у 2002 годдзе. Такім чынам, за год колькасць адміністратыўных спраў павялічылася на 13,6%, што з'яўляецца даволі рэзкім павелічэннем у параўнанні з тэндэнцыямі мінулых гадоў, калі яно было больш павольным. Судаводства было скончана па ўсіх 328258 адміністратыўных справах. Згодна з рашэннямі па гэтых справах, у дачыненні 282023 асоб вынесеныя пастановы аб накладанні разнастайных адміністратыўных спагнанняў. Такім чынам, 85,9% прыцягнутых да адміністратыўнай адказнасці былі прызнаныя вінаватымі, а ў дачыненні 14,1% прыцягнутых справы былі спыненыя па розных прычынах — з-за невінаватасці, сканчэння тэрміну прыцягнення да адміністратыўнай адказнасці і інш. Такім чынам, у параўнанні з 2002 годам доля апраўданых па адміністратыўных справах павялічылася прыкладна на 1% ад агульнай колькасці прыцягнутых да адміністратыўнай адказнасці.

У 2003 годзе найбольшую долю сярод прыцягнутых да адміністратыўнай адказнасці склалі асобы, якія здзейснілі дробнае хуліганства — 113006 (альбо 34,4%), дробны крадзёж дзяржаўнай альбо грамадскай маёмасці — 63919 (19,5%). За здзяйсненне мытных правапарушэнняў да адказнасці прыцягнута 12325 (3,8%) асоб, парушэнне вызначанага парадку ажыццяўлення валютных аперацый — 5368 (1,6%). У параўнанні з мінулым годам павялічылася колькасць прыцягнутых да адміністратыўнай адказнасці за гандаль у неўстаноўленых месцах (на 66,5%), за дробнае хуліганства (на 17,8%), за кіраванне транспартнымі сродкамі ў стане алкагольнага ап'янення (на 6,2%), за наўмыснае нанясенне лёгкіх цялесных пашкоджанняў альбо пабояў (на 4,4%), за распіццё спіртовых напояў у грамадскіх месцах (на 3,8%).

У 2003 годзе ў адносінах да 180737 правапарушальнікаў вызначана спагнанне ў выглядзе штрафу, агульная сума якога па краіне

склала 14539681 тысячу рублёў. З агульнай сумы прызначанага штрафу было спагнана 9985196 тысяч рублёў, альбо 60,4%.

У 2003 годзе адміністратыўнае спагнанне ў выглядзе выпраўленчых работ было прызначана ў дачыненні да 8384 (3,5%) асоб, арышт — 74761 (26,5%) асобы. Канфіскацыя рэчаў выкарыстана ў якасці асноўнага альбо дадатковага спагнання ў дачыненні да 26832 асоб (9,5%), пры гэтым рост у параўнанні з мінулым годам склаў 36,3%.

Відавочная няўвага да спраў аб адміністратыўных правапарушэннях адвакатаў. У выніковых справаздачах рэспубліканскай і абласных калегій адвакатаў іх удзел у абароне асоб у ходзе разгляду адміністратыўных спраў не адлюстраваны — гэтыя справы не вылучаюцца ў спецыяльную групу ў адвакацкай справаздачнасці і ўлічваюцца разам са справамі грамадзянскага судаводства.

Адначасова ёсць звесткі пра дастаткова добрую выніковасць працы адвакатаў па гэтай катэгорыі спраў, якія дэманструюць, што пры ўдзеле адвакатаў колькасць асоб, прызнаных невінаватымі ў здзяйсненні адміністратыўных правапарушэнняў, істотна большая, чым у справах, дзе адвакаты не ўдзельнічаюць. У прыватнасці, згодна са справаздачай рэспубліканскай калегіі адвакатаў за 2002 год, агульны працэнт адстаяных пазіцый па справах аб адміністратыўных правапарушэннях складаў па краіне 53%, у тым ліку па Брэсцкай вобласці — 52%, па Віцебскай вобласці — 62%, па Гомельскай вобласці — 47%, па Гродзенскай вобласці — 65%, па Мінскай вобласці — 60%, па Магілёўскай вобласці — 46%, па горадзе Мінску — 43% (дадзеныя прыведзены з улікам абскарджання ў судах вышэйшай інстанцыі ў парадку нагляду). Пры гэтым трэба адзначыць, што ў параўнанні з 2001 годам працэнт адстаяных пазіцый па адміністратыўных справах паменшыўся на 7% (у 2001 годзе ён складаў 60%).

У 2003 годзе тэндэнцыя памяншэння выніковасці працы адвакатаў па адміністратыўных справах захавалася — агульны працэнт адстаяных пазіцый па адміністратыўных справах з удзелам адвакатаў склаў толькі 48%, што на 5% меней, чым у 2002 годзе, і на 12% меней, чым у 2001 годзе. У тым ліку па Брэсцкай вобласці працэнт адстаяных пазіцый склаў 39% (зменшыўся ў параўнанні з 2002 годам на 13%), па Віцебскай вобласці — 56% (зменшыўся на 6%), па Гомельскай вобласці — 56% (павялічыўся на 9%), па Гродзенскай вобласці — 47% (зменшыўся на 18%), па Мінскай вобласці — 46%

(зменшыўся на 14%), па Магілёўскай вобласці — 48% (павялічыўся на 2%), па горадзе Мінску — 48% (павялічыўся на 5%).

Вядома, што ў 2003 годзе ў парадку аказання бясплатнай юрыдычнай дапамогі адвакаты прынялі ўдзел у 284 працэсах, у тым ліку ў 23 справах у Брэсцкай вобласці, у 14 справах у Віцебскай вобласці, у 25 справах у Гомельскай вобласці, у 21 справе ў Гродзенскай вобласці, у 41 справе ў Мінскай вобласці, у 72 справах у Магілёўскай вобласці, у 88 справах у горадзе Мінску. Відавочна, што з гэтых паказчыкаў вынікае мізэрны ўдзел прафесійных абаронцаў у разглядзе спраў аб адміністратыўных правапарушэннях.

Як сведчаць дадзеныя адвакацкіх калегій, найчасцей адвакаты аказваюць юрыдычную дапамогу па адміністратыўных справах індывідуальным прадпрымальнікам, службовым асобам і грамадзянам, якія прыцягваюцца да адказнасці па артыкулах, звязаных з правапарушэннямі ў галіне гандлю, фінансаў, прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай дзейнасці, а таксама па мытных справах. Даволі вялікая доля ўдзелу адвакатаў па справах, звязаных з парушэннем устаноўленага парадку правядзення мітынгаў і пікетаванняў, выкарыстання незарэгістраванай сімволікі, дзейнасці ад імя незарэгістраваных грамадскіх аб’яднанняў і іншых справах, што маюць палітычнае адценне. У гэтым істотную ролю адыграла ўвага да гэтай катэгорыі спраў з боку праваабарончых арганізацый, аднак эфектыўнасць працы адвакатаў па гэтых справах у дадзены момант з’яўляецца невялікай. Калі ў 2000 і 2001 гадах юрыдычная дапамога з боку адвакатаў часта прыводзіла да апраўдання абвінавачанага ў адміністратыўным правапарушэнні, то пачынаючы з 2003 года амаль не сустракаецца прэцэдэнтаў, калі б дапамога адваката змяніла першапачатковы абвінаваўчы ўхіл суда.

Невялікі ўдзел адвакатаў у адміністратыўных справах таксама вызначаны яшчэ і тым, што ў Беларусі не хапае адвакацкіх паслуг. У 2003 годзе адзін адвакат прыпадаў на 6277 грамадзянаў (ад аднаго адваката на 3294 жыхара Мінска да аднаго адваката на амаль 10000 жыхароў Магілёўскай вобласці).

Да 2003 года да ўдзелу ў справах аб адміністратыўных правапарушэннях у якасці прадстаўніка дапускаліся праваабаронцы і члены грамадскіх аб’яднанняў. Гэта адбывалася ў адпаведнасці з Пастановай пленума Вярхоўнага суда ад 25 сакавіка 1999 года № 1 «Аб прак-

тыцы выкарыстання судамі заканадаўства, якое рэгулюе судаводства па справах аб адміністратыўных правапарушэннях». У пункце 5 згаданай пастановы адзначана, што прадстаўнікамі асобы, якая прыцягваецца да адміністратыўнай адказнасці, альбо пацярпелага можа быць як законны прадстаўнік (у адпаведнасці з артыкулам 249 КаАП), так і іншая асоба, дапушчаная судом да ўдзелу ў справе ў якасці прадстаўніка (у адпаведнасці з артыкулам 62 Канстытуцыі). Такая практыка дазваляла асобам, якія прыцягваюцца да адміністратыўнай адказнасці, і ў прыватнасці тым, што абвінавачваюцца па палітычных матывах, карыстацца кваліфікаванай юрыдычнай дапамогай з боку праваабаронцаў. Эфектыўнасць працы праваабаронцаў па прадстаўніцтве інтарэсаў абвінавачаных па адміністратыўных справах ацаніць цяжка, але прадстаўнікі Праваабарончага цэнтра «Вясна» маюць дастаткова вялікі вопыт, калі яны здолелі адстаяць інтарэсы асоб у адміністратыўных працэсах.

Аднак у 2003 і 2004 гадах суддзі рэзка зменшылі магчымасці грамадзянаў карыстацца ў судах паслугамі прадстаўнікоў. Гэта адбылося ў выніку прыняцця 13 красавіка 2003 года Дэкрэта «Аб некаторых пытаннях грамадзянскага судаводства», якім грамадскім аб’яднанням было забаронена прадстаўляць у судзе чые-небудзь інтарэсы, акрамя сваіх членаў. Хоць гэты дэкрэт прама не абмяжоўвае права грамадзянаў як фізічных асоб на ўдзел у адміністратыўных працэсах у якасці прадстаўніка правапарушальніка, рэальна суды сталі меней дапускаць да ўдзелу ў адміністратыўных працэсах прадстаўнікоў правапарушальнікаў. Фактычна, згодна з існуючым палажэннем, вырашэнне гэтага пытання аддадзена на разгляд суддзі.

Апошнім дакументам, якім была абагульнена практыка разгляду судамі адміністратыўных спраў, была Пастанова пленума Вярхоўнага суда ад 25 сакавіка 1999 года № 1 «Аб практыцы выкарыстання судамі заканадаўства, якое рэгулюе судаводства па справах аб адміністратыўных правапарушэннях». Акрамя згаданай акалічнасці наконт магчымасці ўдзелу прадстаўнікоў правапарушальніка, у ёй закраналіся і іншыя пытанні. У прыватнасці, было адзначана, што суды не заўсёды адпаведным чынам выконваюць патрабаванні заканадаўства аб адміністратыўных справах: не надаюць неабходнай увагі належнаму афармленню матэрыялаў справы і рашэння па справе, парушаюць тэрміны разгляду. Вярхоўны суд звяртае ўвагу

раённых судоў на неабходнасць улічваць прэзумпцыю невінаватасці ў дачыненні да асобы, што прыцягваецца да адміністратыўнай адказнасці, прымаць меры да ўсебаковага і аб'ектыўнага даследавання абставін справы, абараняць правы і свабоды грамадзянаў, што ўдзельнічаюць у справе, паважаць іх годнасць, выконваць правілы аб падведамственнасці разгляду справы. Вярхоўны суд адзначае важнасць належнага афармлення пратакола аб адміністратыўных правапарушэннях і ўстанаўлівае, што калі пратакол не афармлены належным чынам, суддзя павінен накіроўваць яго на дапрацоўку ў той орган, які склаў пратакол. Суд таксама тлумачыць важнасць давядзення да ведама ўдзельнікаў працэсу іх правоў і важнасць выканання правіла аб разглядзе справы ў прысутнасці асобы, што прыцягваецца да адміністратыўнай адказнасці.

Увогуле дадзеная пастанова з'яўляецца важным актам, які ўстанаўлівае пэўны стандарт выкарыстання КаАП 1984 года ў сучасных умовах і з улікам сучасных стандартаў правоў чалавека ў Беларусі. Аднак трэба адзначыць, што шмат якія моманты прыцягнення да адміністратыўнай адказнасці не знайшлі адлюстравання ў дадзеным акце, а шмат у чым ён ужо паспеў састарэць у сувязі з прыняццем новых актаў заканадаўства. Такім чынам, наспела неабходнасць дадатковага тлумачэння Вярхоўным судом практыкі разгляду спраў аб адміністратыўных правапарушэннях. Гэта тым больш важна ў сувязі з пераходам да новага адміністратыўнага заканадаўства, увядзенне якога патрабуе большай увагі судоў краіны да пытанняў выканання правоў грамадзянаў падчас іх прыцягнення да адміністратыўнай адказнасці.

На жаль, афіцыйная судовая статыстыка пры аналізе практыкі прыцягнення да адміністратыўнай адказнасці не надае дастатковай увагі пытанням выканання правоў грамадзянаў, засяроджваючыся на колькасных і фармальных паказчыках. У сумеснай Пастанове прэзідыума Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь і калегіі Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад 13.02.2003 «Аб выніках працы судоў і органаў юстыцыі Рэспублікі Беларусь за 2002 год і задачах па далейшым удасканаленні правасуддзя» адзначаюцца ў якасці асноўных адмоўных рыс судаводства па адміністратыўных правапарушэннях нематываванае невыкарыстанне судамі ў дастатковай ступені канфіскацыі транспартных сродкаў і тавараў у якасці меры

пакарання, павелічэнне колькасці апратэставання і абскарджання судовых пастаноў аб адміністрацыйных правапарушэннях, распаўсюджанасць практыкі спынення адміністрацыйнага пераследу па малазначнасці справы без дастатковых для таго падстаў. Пры гэтым рэзалюцыйная частка дадзенай пастановы ў пытанні якасці судовай працы па адміністрацыйных справах абмяжоўваецца загадам абласным судам узмацніць кантроль за разглядам гэтай катэгорыі спраў. Такім чынам, важныя пытанні выканання правоў і законных інтарэсаў грамадзянаў падчас прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці застаюцца па-за ўвагай супрацоўнікаў адказных дзяржаўных органаў і не маюць дастатковага статыстычнага вымярэння.

Пастанова пленума Вярхоўнага суда ад 23.12.1999 «Аб павышэнні культуры судовай дзейнасці і паляпшэнні арганізацыі судовых працэсаў» у дадзены момант з’яўляецца асноўным дакументам у накірунку пераабсталявання судоў і судовых будынкаў.

Дзяржаўныя органы прызнаюць неабходнасць паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння судоў. Гэта таксама адзначаецца ў сумеснай Пастанове прэзідыума Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь і калегіі Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад 13.02.2003 «Аб выніках працы судоў і органаў юстыцыі Рэспублікі Беларусь за 2002 год і задачах па далейшым удасканаленні правасуддзя». Аднак у паляпшэнні матэрыяльна-тэхнічнага абсталявання судоў і рэканструкцыі судовых будынкаў не ўлічваецца неабходнасць наладжвання працы па павелічэнні доступу да правасуддзя. Пытанні абсталявання гардэробаў, прыбіральняў і буфетаў для наведвальнікаў вырашаюцца асабіста старшынямі судоў зыходзячы з уласных меркаванняў і пры адсутнасці выразнай пазіцыі кіраўніцтва судовай сістэмы.

У дадзены момант усе суды рэспублікі абсталяваныя камп’ютэрамі, капіравальна-памнажальнай тэхнікай, маюць аўтамабілі. Аднак пры гэтым недастатковая ўвага надаецца абсталяванню працоўных месцаў сакратароў — ва ўсіх судах краіны сакратары па-ранейшаму вядуць пратакол ад рукі алоўкам (што недапушчальна для афіцыйнага дакумента) альбо асадкай, спецыяльныя сакратарскія прыстасаванні адсутнічаюць. Даючы справаздачу пра тое, што зараз ва ўсіх судах краіны ёсць тэлефоны, кіраўніцтва судовай сістэмы не звяртае ўвагі на тое, што наяўнасць у судах агульнадаступнага тэле-

фона-аўтамата па-ранейшаму з'яўляецца выключэннем — пры даволі жорсткім прапускным рэжыме гэта часам стварае вялікія перашкоды ў доступе да правасуддзя.

У якасці пазітыўных змен у арганізацыі працы судоў і забеспячэнні доступу грамадзянаў да суда можна разглядаць меры, прынятыя ў судах па ініцыятыве Міністэрства юстыцыі ў выкананне Дырэктывы Прэзідэнта № 1 «Аб некаторых мерах па ўмацаванні грамадскай бяспекі і дысцыпліны». Так, у межах гэтых мер, у мэтах належнай арганізацыі прыёму і паляпшэння працы па разглядзе і прыняцці рашэнняў па зваротах грамадзянаў, ва ўсіх судах мусяць быць афармленыя стэнды нагляднай інфармацыі, на якіх у абавязковым парадку размяшчаюцца звесткі пра час працы суда, час і месца прыёму грамадзянаў, спісы спраў, што разглядаюцца судом, а таксама графікі прыёму грамадзянаў ва ўпраўленнях юстыцыі аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама, у абласных і Мінскім гарадскім судах і ў Міністэрстве юстыцыі, нумар «тэлефона даверу» Міністэрства юстыцыі (206-37-30).

Такія крокі сведчаць пра імкненне да ўдасканалення працы судоў у накірунку належнага забеспячэння права грамадзянаў на доступ да суда.

# 3. Метадалогія даследавання

## Стратэгія маніторынгу

Метадалагічнай асновай дадзенай праграмы маніторынгу (асновай для выпрацоўкі стратэгіі даследавання і інструментарыя даследавання) былі матэрыялы, распрацаваныя Хельсінкскім Фондам па правах чалавека (Варшава, Польшча).

Агульная ***мэта*** дадзенай праграмы маніторынгу — правесці аналіз выканання права на справядлівае судовае разбіральніцтва падчас разгляду спраў аб адміністратыўных правапарушэннях і ўнесці прапановы па прывядзенні працэсуальнага заканадаўства і судовай практыкі ў адпаведнасць са стандартамі правоў чалавека. Вынікі дадзенага даследавання дапамогуць дамагчыся паляпшэння выканання правоў грамадзянаў на справядлівае судовае разбіральніцтва падчас разгляду спраў аб адміністратыўных правапарушэннях.

Аператыўныя ***задачы*** даследавання:

- правесці назіранне за разглядам спраў аб адміністратыўных правапарушэннях у пяці судах горада Мінска (суды Цэнтральнага, Першамайскага, Ленінскага, Заводскага, Савецкага раёнаў), трох судах горада Віцебска (суды Кастрычніцкага і Чыгуначнага раёнаў, а таксама суд Віцебскага раёна), двух судах горада Брэста (суды Маскоўскага і Ленінскага раёнаў) і ў двух судах Полацкага раёна (суд горада Наваполацка і суд горада Полацка і Полацкага раёна);
- падчас назірання фіксаваць выяўленыя парушэнні ў лістах назірання згодна з адзначанымі ў іх пытаннямі;
- зафіксаваць матэрыяльна-тэхнічныя ўмовы працы дадзенага суда ў агульным лісце назірання;
- апрацаваць запоўненыя назіральнікамі анкеты і вывесці кансалідаваныя лічбы па кожным з пастаўленых у лістах назірання пытаннях зыходзячы з існуючай іерархіі прававых норм;
- зрабіць высновы па атрыманых лічбах адносна выканання правоў чалавека і працэсуальных норм падчас разгляду адміністратыўных спраў у судах;

- распрацаваць прапановы па паляпшэнні судовай практыкі падчас разгляду адміністратыўных правапарушэнняў;
- распрацаваць прапановы па замацаванні ў новым Працэсуальна-выканаўчым кодэксе аб адміністратыўных правапарушэннях гарантый выканання правоў чалавека.

Такім чынам, галоўнай ***функцыяй*** нашага даследавання з'яўлялася атрыманне задакументаваных дадзеных пра стан выканання працэсуальных правоў і правоў чалавека падчас разгляду судамі Беларусі спраў аб адміністратыўных правапарушэннях і вызначэнне таго, якія змены ў заканадаўстве і ў практыцы яго выкарыстання маглі б абмежаваць парушэнні гэтых правоў у дадзенай сферы.

Разам з асноўнай даследаванне таксама выконвала і дапаможныя функцыі: папярэджанне парушэння правоў чалавека ў ходзе адміністратыўных працэсаў у канкрэтным судзе праз акцэнтаванне грамадскай увагі да гэтай катэгорыі працэсаў, павелічэнне грамадскай увагі да праблемы выканання правоў чалавека падчас разгляду адміністратыўных спраў праз публікацыі ў прэсе, удасканаленне навыкаў удзельнікаў праграмы ў галіне маніторынгу правоў чалавека як важным складніку праваабарончай дзейнасці.

***Крыніцамі інфармацыі*** пры ажыццяўленні дадзенай праграмы маніторынгу сталі вынікі аналізу заканадаўства і судовай практыкі, а таксама дадзеныя, атрыманыя ў выніку непасрэднага назірання за разглядам спраў аб адміністратыўных правапарушэннях.

## Апісанне даследавання

Назіранне за працай суддзяў судоў базавага ўзроўню па разглядзе спраў аб адміністратыўных правапарушэннях ладзілася на працягу двух тыдняў з 22 сакавіка па 2 красавіка (дзесяць працоўных дзён суда). Перад назіральнікамі стаяла задача прысутнічаць на максімальна магчымай колькасці адміністратыўных працэсаў, што адбываліся ў гэтых судах. Пры гэтым на кожны з адсочаных адміністратыўных працэсаў запаўняўся асобны ліст назірання. Таксама назіральнікі запаўнялі агульны ліст назірання за матэрыяльна-тэхнічным станам дадзенага суда.

Працу назіральнікаў каардынавалі на месцах кіраўнікі мясцовых аддзяленняў ПЦ «Вясна». Напярэдадні даследавання назіральнікам

была выдадзена падрабязная інструкцыя па тэхналогіі правядзення маніторынгу і праведзены навучальныя заняткі. Таксама назіральнікі былі ўзброеныя вытрымкамі з Кодэкса аб адміністратыўных правапарушэннях, вытрымкамі з Грамадзянскага прэцэсуальнага кодэкса і тэкстам Пастановы пленума Вярхоўнага суда ад 25 сакавіка 1999 года № 1 «Аб практыцы выкарыстання судамі заканадаўства, якое рэгулюе судаводства па справах аб адміністратыўных правапарушэннях».

Інструментарый даследавання быў распрацаваны сацыёлагам на падставе пастаўленых каардынатарам маніторынгу пытанняў. Пытанні, сфармуляваныя ў лістах назірання і ў агульным лісце назірання, адпавядаюць ***даследчыцкім пытанням***, пастаўленым напярэдадні даследавання па выніках папярэдняга аналізу заканадаўства і судовай практыкі:

- Колькі адміністратыўных спраў было разгледжана за перыяд назірання?
- Колькі часу адбываўся разгляд справы?
- Ці былі пераносы разгляду справы? Ці была затрымка пачатку працэсу?
- У якім памяшканні адбывалася пасяджэнне? Ці было гэтае памяшканне належным чынам прыстасаванае для працы суддзі?
- Ці забяспечана галоснасць працэсу?
- Ці выконваюцца ўсе патрабаванні заканадаўства адносна парадку вядзення пасяджэння па справе аб адміністратыўным правапарушэнні?
- Ці растлумачаны правапарушальніку належным чынам яго правы як удзельніка працэсу і сутнасць прад’яўленага абвінавачання?
- Ці выконвалася права абвінавачанага на прадастаўленне доказаў у сваю абарону, на даванне паказанняў на роднай мове, на абарону з боку адваката альбо іншага прадстаўніка?
- Якім чынам разглядаліся заяўленыя хадайніцтвы?
- Якой была працэдура абвяшчэння рашэння па справе?
- Якім чынам парушэнні правоў правапарушальніка ўплывалі на вынік справы?
- Якое стаўленне да справы дэманстраваў суддзя?
- Ці выконваўся ў судовым будынку парадак працы з грамадзянамі?

- Ці быў прыстасаваны будынак для працы суда?
- Ці забяспечаны доступ грамадзянаў да суда?
- Ці забяспечаны доступ інвалідаў да суда?
- Ці змешчана ў будынку суда неабходная грамадзянам інфармацыя?

Ніжэй змешчаныя вытрымкі з інструкцыі, раздадзенай назіральнікам, а таксама даследчыцкі інструментарый у выглядзе лістоў назірання.

***Вытрымкі з інструкцыі назіральнікам***

*Галоўная мэта назірання — сабраць інфармацыю пра ход усіх адміністратыўных працэсаў у судах, дзе адбываецца маніторынг, — дадзеныя пра выкананне ў ходзе гэтых працэсаў патрабаванняў працэсуальнага заканадаўства, пра выкананне права на справядлівае судовае разбіральніцтва, пра матэрыяльна-тэхнічныя ўмовы працы суддзяў.*

***Дзеля дасягнення мэты** ў суды накіроўваюцца назіральнікі, якія павінны дзяжурыць у судзе, прысутнічаць на адміністратыўных працэсах, назіраць за імі і занатоўваць атрыманыя звесткі ў лістах назірання. Каардынатар мусіць забяспечыць назіральнікаў лістамі назірання, размеркаваць назіральнікаў па судах і, у залежнасці ад абстаноўкі ў канкрэтным судзе, вызначыць размеркаванне працы і яе графік для назіральнікаў, а таксама штодзённа кантраляваць іх працу.*

*Канчатковы агульны ліст назірання запаўняецца каардынатарам на кожны раённы суд асобна.*

***Стратэгія дзейнасці. Назіральнікі павінны:***
- *прысутнічаць у судзе, у якім ажыццяўляецца назіранне, з 22 сакавіка па 2 красавіка ўключна (за выключэннем тых дат, калі суд не працуе);*
- *пры ажыццяўленні назірання мець пры сабе пашпарт, дадзеную інструкцыю, дастатковую колькасць незапоўненых лістоў назірання, асадку, чыстую паперу;*
- *напачатку кожнага дня назірання даведвацца з інфармацыйнай дошкі, аб'яў, ад сакратароў, у канцылярыі, ад суддзяў па адміністратыўных справах альбо іншым чынам, колькі*

*адміністратыўных спраў будзе разглядацца ў гэтым судзе ў канкрэтны дзень. Таксама трэба сачыць за тым, ці прыносяць супрацоўнікі міліцыі ў пакой адміністратыўнага суддзі так званы «адміністратыўны матэрыял» (у выглядзе папак) — гэта будзе сведчыць пра хуткі пачатак адміністратыўнага працэсу;*

- *імкнуцца патрапіць на як мага большую колькасць працэсаў, на якіх разглядаюцца справы аб адміністратыўных правапарушэннях. Дзеля гэтага неабходна, каб каардынатар размеркаваў і замацаваў, прынамсі, па адным назіральніку за кожным з суддзяў, што разглядаюць адміністратыўныя справы;*
- *падчас знаходжання на кожным адміністратыўным працэсе запоўніць асобны ліст назірання. Калі няма магчымасці запоўніць ліст цалкам падчас працэсу з-за таго, што ён адбыўся вельмі хутка альбо суддзя забараніў рабіць запісы — няўнесеныя звесткі ўносяцца ў ліст назірання ў той жа дзень пасля заканчэння працы суда;*
- *пастаянна даведвацца ў канцылярыі (сакратарыяце) суда альбо з дошкі інфармацыі аб прызначаных на сённяшні і бліжэйшыя дні адміністратыўных справах, паколькі на працягу дня могуць з’яўляцца новыя справы;*
- *імкнуцца наладзіць добрыя стасункі з супрацоўнікамі суда — суддзямі, сакратарамі, аховай. Для гэтага важна паводзіць сябе ветліва і карэктна;*
- *штодзённа паведамляць каардынатару пра ход маніторынгу, колькасць адсочаных адміністратыўных спраў і тыя праблемы, што паўстаюць у ходзе назірання. Таксама можна перадаваць і ўжо запоўненыя лісты назірання;*
- *падчас назірання рабіць нататкі для далейшага (па заканчэнні назірання) запаўнення першапачатковага варыянта агульнага ліста назірання — пасля на іх падставе каардынатар будзе апрацоўваць і зводзіць гэтыя звесткі ў канчатковы варыянт агульнага ліста назірання для дадзенага суда;*
- *па меры назапашвання запоўненых лістоў назірання (але не пазней за наступны дзень пасля заканчэння маніторынгу) усе запоўненыя лісты назірання, запоўнены агульны ліст назірання, усе іншыя заўвагі і нататкі здаюцца каардынатару для апрацоўкі і адпраўкі ў Мінск.*

*Меры бяспекі*

*Маніторынг адміністратыўных працэсаў адбываецца цалкам у адпаведнасці з заканадаўствам, паколькі адміністратыўныя правапарушэнні разглядаюцца адкрыта (на гэта ёсць спасылка ў кожнай анкеце). Аднак назіральнік мусіць быць гатовым да непрыязнага стаўлення супрацоўнікаў суда і суддзяў (паколькі мы спрабуем наладзіць грамадскі кантроль за іх працай). Таму, калі назіраецца відавочна негатыўнае стаўленне да маніторынгу, мэтазгодна не казаць, што ў судзе адбываецца нейкае даследаванне, а сцвярджаць, што «мы проста хочам прысутнічаць на працэсах і наша права на гэта гарантавана законам». Калі суддзя забараняе запаўняць ліст назірання, трэба паспрабаваць запомніць ход працэсу альбо занатаваць на нейкім аркушы (потым занесяце гэтыя звесткі ў ліст назірання з пазначэннем перашкод, што чыніліся маніторынгу).*

*ВАЖНАЯ ЗАЎВАГА*

*Назіральнік мусіць дзейнічаць як просты грамадзянін Беларусі, а не як прадстаўнік праваабарончай арганізацыі. Гэта неабходна, каб пазбегнуць супрацьдзеяння з боку суда.*

KAMUNIKAT.org

Інструментарый: лісты назірання

## ЛІСТ НАЗІРАННЯ

### Справа аб адміністратыўным правапарушэнні

У адпаведнасці з артыкулам 229 Кодэкса аб адміністратыўных правапарушэннях справа аб адміністратыўным правапарушэнні разглядаецца адкрыта.

1. ГОРАД ______________ НАЗВА СУДА ______________ ІМЯ СУДДЗІ ____________________________
2. ДАТА І ЧАС ПАЧАТКУ ПРАЦЭСУ ________ ______ ДАТА І ЧАС ЗАКАНЧЭННЯ _____________
3. ЦІ БЫЛІ ПЕРАНОСЫ РАЗГЛЯДУ СПРАВЫ? **А** не / **В** так, быў перанос на тэрмін ________________
4. МЕСЦА РАЗГЛЯДУ СПРАВЫ **А** кабінет суддзі / **В** судовая зала / **С** іншае _______________________
5. ПРЫКЛАДНАЯ КОЛЬКАСЦЬ МЕСЦАЎ ДЛЯ ПУБЛІКІ _________________
6. ЦІ БЫЛО АБВЕШЧАНА Ў СУДЗЕ ПРА ПАЧАТАК ПРАЦЭСУ? **А** не / **В** так *(якім чынам)* _________
7. ЦІ БЫЛА ЗАТРЫМКА ПАЧАТКУ ПРАЦЭСУ? **А** не / **В** так, была затрымка на ________, верагодная прычына________________________________________________________________________________
8. ЦІ БЫЎ АБВЕШЧАНЫ СКЛАД СУДА? **А** так / **В** не
9. ЦІ ПРЫСУТНІЧАЕ САКРАТАР? **А** так / **В** не
10. ЦІ ВЯДЗЕЦЦА ПРАТАКОЛ СУДОВАГА ПАСЯДЖЭННЯ? **А** так / **В** не
11. ЦІ ЗАБЯСПЕЧАНЫ ДОСТУП ПУБЛІКІ ДА ПРАЦЭСУ? **А** так / **В** не *(перашкоды)* ________________

12. АРТЫКУЛ КААП, ПА ЯКІМ ВЯДЗЕЦЦА СПРАВА (нумар, назва і частка ) _______________________
_____________________________________________________________________________________________________
_________________________________________________________________________________

13. ДАТА І МЕСЦА ЗДЗЯЙСНЕННЯ ПРАВАПАРУШЭННЯ ______________________________
14. ЦІ ПРЫСУТНІЧАЕ ПРАВАПАРУШАЛЬНІК? **А** так / **В** не
15. ЯКІМ ЧЫНАМ ПРАВАПАРУШАЛЬНІК БЫЎ ПАВЕДАМЛЕНЫ ПРА ДАТУ РАЗГЛЯДУ СПРАВЫ І ЗА КОЛЬКІ ДЗЁН *(спытаць правапарушальніка альбо са слоў суддзі)*________________________________
________________________________________________________________________________
16. ЦІ БЫЎ ПРЫВОД АЛЬБО КАНВАІРАВАННЕ З БОКУ МІЛІЦЫЯНЕРАЎ? **А** так / **В** не
17. ЦІ БЫЛА ПРАВЕРКА ЯЎКІ І ВЫСВЯТЛЕННЕ АСОБ УДЗЕЛЬНІКАЎ ПРАЦЭСУ? **А** так / **В** не
18. НА ЯКОЙ МОВЕ ВЯДЗЕЦЦА ПРАЦЭС? **А** руская / **В** беларуская
19. НА ЯКОЙ МОВЕ ДАЕ ПАКАЗАННІ ПРАВАПАРУШАЛЬНІК? **А** руская / **В** беларуская / **С** іншая
20. КАЛІ ПРАВАПАРУШАЛЬНІК ДАЕ ПАКАЗАННІ НЕ НА МОВЕ ВЯДЗЕННЯ ПРАЦЭСУ, ТО ПЕРАКЛАД АЖЫЦЦЯЎЛЯЕ **А** сакратар / **В** перакладчык / **С** суддзя / **D** іншае ______________________________
21. ЦІ РАСТЛУМАЧАНЫ ПРАВАПАРУШАЛЬНІКУ ЯГО ПРАВЫ? **А** так / **В** не / **С** часткова, не былі растлумачаны наступныя правы ______________________________________________________________
22. ЦІ СПЫТАЎ СУДДЗЯ ПРАВАПАРУШАЛЬНІКА «ЦІ ЗРАЗУМЕЛЫЯ ВАМ ВАШЫЯ ПРАВЫ?» **А** так / **В** не
23. ЦІ РАСТЛУМАЧАНА ПРАВАПАРУШАЛЬНІКУ ПРАВА ЗАЯВІЦЬ АДВОД СУДДЗІ? **А** так / **В** не
24. КОЛЬКАСЦЬ СВЕДКАЎ ПА СПРАВЕ СКЛАДАЕ _____ чалавек
25. ЦІ ЗАСТАЮЦЦА ДАПЫТАНЫЯ СВЕДКІ Ў ЗАЛІ ПАСЯДЖЭННЯ? *(калі ёсць сведкі)* **А** так / **В** не
26. ЦІ ПРЫМАЕ ЎДЗЕЛ У ПРАЦЭСЕ АДВАКАТ? **А** так / **В** не
27. ЦІ ПРЫМАЕ ЎДЗЕЛ У ПРАЦЭСЕ ПРАДСТАЎНІК ПРАВАПАРУШАЛЬНІКА? **А** так / **В** не
28. ЦІ БЫЎ ПРАЧЫТАНЫ ЎГОЛАС ПРАТАКОЛ АБ АДМІНІСТРАТЫЎНЫМ ПРАВАПАРУШЭННІ? **А** не / **В** так, пратакол быў прачытаны ўголас, складзены *(орган і дата)* ______________________________
________________________________________________________________________________
29. ПАСЛЯ ДАСЛЕДАВАННЯ ЎСІХ МАТЭРЫЯЛАЎ СПРАВЫ ЦІ ЗАПЫТАЎ СУДДЗЯ Ў ПРАВАПАРУШАЛЬНІКА ПРА ЖАДАННЕ ДАДАЦЬ НЕШТА ДА МАТЭРЫЯЛАЎ СПРАВЫ? **А** так / **В** не
30. ЦІ ПРЫМАЕ ЎДЗЕЛ У ПРАЦЭСЕ ПРАКУРОР? **А** так / **В** не
ЦІ ЗАЯЎЛЯЛІСЯ ХАДАЙНІЦТВЫ З БОКУ ПРАВАПАРУШАЛЬНІКА?
31. - ПРА ВЫКЛІКАННЕ СВЕДКАЎ — **А** так, і задаволенае / **В** так, але адхіленае / **С** не, не заяўлялася
32. - ПРА ПРАГЛЯД ВІДЭАСТУЖАК — **А** так, і задаволенае / **В** так, але адхіленае / **С** не, не заяўлялася

33. - ПРА ДАДАТКОВЫЯ ДОКАЗЫ — А так, і задаволенае / В так, але адхіленае / С не, не заяўлялася
34. - ПРА ЎДЗЕЛ АДВАКАТА — А так, і задаволенае / В так, але адхіленае / С не, не заяўлялася
35. - ПРА ЎДЗЕЛ ПРАДСТАЎНІКА — А так, і задаволенае / В так, але адхіленае / С не, не заяўлялася
36. - ПРА ЎДЗЕЛ ПЕРАКЛАДЧЫКА — А так, і задаволенае / В так, але адхіленае / С не, не заяўлялася
37. - ПРА МОВУ ПРАЦЭСУ — А так, і задаволенае / В так, але адхіленае / С не, не заяўлялася
38. - ПРА ПЕРАНОС СПРАВЫ — А так, і задаволенае / В так, але адхіленае / С не, не заяўлялася
39. - ПРА АДВОД СУДДЗІ — А так, і задаволенае / В так, але адхіленае / С не, не заяўлялася
40. - ПРА АЗНАЯМЛЕННЕ З МАТЭРЫЯЛАМІ — А так, і задаволенае / В так, але адхіленае / С не, не заяўлялася

41. ЯКІМ ЧЫНАМ АДБЫВАЎСЯ РАЗГЛЯД ХАДАЙНІЦТВАЎ? А суддзя вырашаў адразу на месцы / В суддзя выходзіў у дарадчы пакой / С па-рознаму ў залежнасці ад сэнсу хадайніцтва
КАРОТКА АПІШЫЦЕ ПРАЦЭДУРУ РАЗГЛЯДУ ХАДАЙНІЦТВА ________________________________________________
__________________________________________________________________________________________

42. ЦІ ВЫХОДЗІЎ СУДДЗЯ ПЕРАД ПРЫНЯЦЦЕМ КАНЧАТКОВАГА РАШЭННЯ ПА СПРАВЕ Ў ДАРАДЧЫ ПАКОЙ?
- А так, на тэрмін ________, папярэдне назваўшы час абвяшчэння рашэння
- В так, на тэрмін ________, але папярэдне не назваўшы час абвяшчэння рашэння
- С не, суддзя вынес рашэнне адразу на месцы
КОРАТКА АПІШЫЦЕ ПРАЦЭДУРУ АБВЯШЧЭННЯ РАШЭННЯ ________________________________________________
__________________________________________________________________________________________

43. ПАСЛЯ АБВЯШЧЭННЯ РАШЭННЯ ЦІ ЗАПЫТАЎСЯ СУДДЗЯ Ў ПРАВАПАРУШАЛЬНІКА, ЗРАЗУМЕЛАЕ ЯМУ АЛЬБО НЕ СУДОВАЕ РАШЭННЕ І ПАРАДАК ЯГО ВЫКАНАННЯ? А так / В не
44. ПАСЛЯ АБВЯШЧЭННЯ РАШЭННЯ ЦІ РАСТЛУМАЧЫЎ СУДДЗЯ ПАРАДАК І ТЭРМІНЫ АБСКАРДЖАННЯ І АПРАТЭСТАВАННЯ РАШЭННЯ? А так / В не / С часткова альбо са скажэннямі
45. ЦІ РАСТЛУМАЧАНЫ ПАРАДАК АТРЫМАННЯ КОПІІ СУДОВАГА РАШЭННЯ? А так / В не
46. ЦІ РАСТЛУМАЧАНЫ ПАРАДАК АЗНАЯМЛЕННЯ З ПРАТАКОЛАМ СУДОВАГА ПРАЦЭСУ? А так / В не
47. АЦАНІЦЕ ПАВОДЗІНЫ СУДДЗІ НА ПРАЦЭСЕ — А карэктныя і афіцыйныя / В фамільярныя / С абразлівыя альбо зневажальныя / D іншае ________________________________________________________________

48. ВЫНІК СПРАВЫ І ЗМЕСТ СУДОВАГА РАШЭННЯ
- A Прызнаны вінаватым, прызначана спагнанне ў выглядзе і памеры ___________________________________________

______________________________________________________________________________________________

- B Прызнаны невінаватым, справа спынена судаводствам
- C Іншае ______________________________________________________________________________________

49. АЦАНІЦЕ СТАЎЛЕННЕ СУДДЗІ ДА НАЗІРАННЯ ЗА ПРАЦЭСАМ І АПІШЫЦЕ ЎМОВЫ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ МАНІТОРЫНГУ ___________________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________________________

50. ІНШЫЯ ЗАЎВАГІ ___________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________________________

KAMUNIKAT.org

***Парадак запаўнення ліста назірання (вытрымкі з інструкцыі назіральнікам)***

*У кожным пункце ліста назірання трэба абводзіць кружком той варыянт, які адпавядае сапраўднаму стану рэчаў на дадзеным судовым пасяджэнні — напрыклад, «А», «В» альбо «С». Некаторыя варыянты патрабуюць больш разгорнутага адказу альбо апісання таго, што адбывалася пры разглядзе спраў (напрыклад, пункт 7, адказ «В», альбо пункт 49). У гэтым выпадку назіральнік мусіць сцісла і лаканічна апісаць тое, што адбывалася падчас разгляду справы. Тыя адказы, графы якіх патрабуюць абавязковага запаўнення, выдзелены шэрым колерам (напрыклад, пункты 1, 2, 12, 24 мусяць быць запоўненыя абавязкова).*

*У дадзенай інструкцыі ўтрымліваюцца спасылкі на артыкулы Кодэкса аб адміністратыўных правапарушэннях (КаАП) і Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса (ГПК) — гэтыя артыкулы мусяць быць уважліва вывучаныя назіральнікамі напярэдадні маніторынгу. Таксама назіральніку мэтазгодна азнаёміцца з пастановай пленума Вярхоўнага суда Беларусі, якая дытычыцца парадку разгляду спраў аб адміністратыўным правапарушэнні.*

*Будзе карысна, калі па заканчэнні праграмы маніторынгу назіральнік коратка (1–2 старонкі) занатуе свае ўражанні і прапановы па паляпшэнні працы суда. Гэта дапаможа апрацаваць вынікі назірання і дасць магчымасць выпрацаваць рэкамендацыі па прадухіленні парушэння працэсуальных норм падчас разгляду адміністратыўных спраў.*

*Лісты назірання запаўняюцца па прынцыпу «адна адміністратыўная справа — адзін ліст назірання». Назіральнік падчас знаходжання на адміністратыўным працэсе мусіць мець перад сабой не толькі чысты ліст назірання, але і чысты аркуш для запісаў. Важна памятаць, што парадак, у якім змешчаныя пытанні ў лісце назірання, не абавязкова будзе дакладна супадаць з парадкам вядзення працэсу. У працэсе магчымыя паўторы і перагляды (напрыклад, суддзя можа спачатку адхіліць хадайніцтва пра адваката, а пасля задаволіць паўторна заяўленае хадайніцтва пра адваката). Таму нічога*

*страшнага, калі вы спачатку занесяце ў ліст назірання памылковыя дадзеныя — гэта будзе чарнавік ліста назірання, а пасля ўвечары вы можаце выправіць іх, запоўніўшы ліст назірання начыста.*

*ВАЖНАЯ ЗАЎВАГА*

*Звесткі, якія назіральнік заносіць у ліст назірання, мусяць быць дакладна спраўджанымі. Такім чынам, назіральнік павінен фіксаваць толькі тое, што ён дакладна бачыў. Калі назіральнік мае нейкія здагадкі (напрыклад, што суддзя, зачыніўшыся з адміністратыўнымі матэрыяламі ў сваім пакоі, выносіў рашэнні па адміністратыўных справах пры адсутнасці правапарушальніка) — трэба адзначыць, што гэта з'яўляецца прыватным меркаваннем назіральніка, а не дакладна высветленым фактам.*

*Пасля заканчэння маніторынгу кожны назіральнік перадае ўсе назапашаныя запоўненыя лісты назірання каардынатару ў сваім горадзе. Каардынатар ажыццяўляе першапачатковую апрацоўку лістоў назірання (сістэматызуе іх па раённых судах, па асобах назіральнікаў, па датах запаўнення і праставўляе адпаведны індэкс. Пасля гэтага каардынатар перадае ўсе лісты назірання ў Мінск для канчатковай апрацоўкі і падсумавання вынікаў. Па выніках гэтай працы будзе праведзены круглы стол, выдадзена і распаўсюджана справаздача, распачнуцца грамадскія дзеянні па паляпшэнні выканання права на справядлівы судовы працэс падчас разгляду спраў аб адміністратыўным правапарушэнні.*

# АГУЛЬНЫ ЛІСТ НАЗІРАННЯ ЗА МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНЫМ СТАНАМ СУДА

1. ГОРАД ______________ НАЗВА СУДА _________________ АДРАС СУДА _____________________________
2. ГАДЗІНЫ ПРАЦЫ СУДА ___________________________________________
3. КІМ АХОЎВАЕЦЦА СУД І МЕРЫ БЯСПЕКІ _______________________________________________________

_____________________________________________________________________________________________________

4. УВАХОД У БУДЫНАК СУДА — **A** вольны / **B** ажыццяўляецца па прад’яўленні пашпарта / **C** ажыццяўляецца па прад’яўленні позвы / **D** ажыццяўляецца па прад’яўленні іншага дакумента / **E** ажыццяўляецца з дазволу суддзі / **F** ажыццяўляецца па папярэднім запісе / **G** іншыя заўвагі адносна абмежавання ўваходу _______________________

_____________________________________________________________________________________________________

5. ЦІ ЁСЦЬ УМОВЫ ДЛЯ БЕСПЕРАШКОДНАГА ЎВАХОДУ Ў БУДЫНАК СУДА ІНВАЛІДАЎ НА ІНВАЛІДНЫХ КАЛЯСКАХ? **A** так / **B** не, існуюць наступныя перашкоды _________________________________________________

_____________________________________________________________________________________________________

ЦІ ЁСЦЬ У БУДЫНКУ СУДА:

6.1. - агульнадаступны гардэроб **A** так / **B** не
6.2. - металадэтэктар на ўваходзе **A** так /**B** не
6.3. - агульнадаступныя гарадскія тэлефоны (аўтаматы) **A** так / **B** не
6.4. - буфет альбо кавярня **A** так / **B** не
6.5. - магчымасць бясплатнай паркоўкі аўтамабіляў наведвальнікаў **A** так / **B** не
6.6. - ліфты (альбо спецыяльныя ліфты для інвалідаў на інвалідных калясках) **A** так / **B** не
6.7. - агульнадаступная бясплатная грамадская прыбіральня **A** так / **B** не
6.8. - бясплатная грамадская прыбіральня, якая замыкаецца на ключ **A** так / **B** не
6.9. - платная грамадская прыбіральня **A** так / **B** не

7. ДАЙЦЕ АГУЛЬНУЮ ХАРАКТАРЫСТЫКУ БУДЫНКУ СУДА (парадак, чысціня, шум, дастатковая плошча, чэргі і г. д.) _____________________________________________________________________________________

_____________________________________________________________________________________________________

8. ЦІ ЁСЦЬ У БУДЫНКУ СУДА ДОШКА ДЛЯ АБ’ЯЎ? **A** так / **B** не
9. КАЛІ Ў СУДЗЕ ЁСЦЬ ДОШКА ДЛЯ АБ’ЯЎ, ТО НА ЯКОЙ МОВЕ ЗМЕШЧАНА ІНФАРМАЦЫЯ? **A** на рускай мове / **B** на беларускай мове / **C** на рускай і часткова на беларускай мовах / **D** поўна на абедзвюх мовах

ЦІ ВЫВЕШАНАЯ НА ДОШЦЫ ДЛЯ АБ'ЯЎ НАСТУПНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ:

10.1. - час пачатку працэсаў, што адбываюцца ў канкрэтны дзень **А** так / **В** не / **С** не цалкам

10.2. - у тым ліку час пачатку адміністратыўных працэсаў у канкрэтны дзень **А** так / **В** не / **С** не цалкам

10.3. - нумары пакояў, у якіх будуць разглядацца справы **А** так / **В** не / **С** не цалкам

10.4. - у тым ліку нумары пакояў, у якіх будуць разглядацца адміністратыўныя справы **А** так / **В** не / **С** не цалкам

10.5. - час пачатку працэсаў, што адбудуцца ў бліжэйшыя дні **А** так / **В** не / **С** не цалкам

10.6. - у тым ліку час пачатку адміністратыўных працэсаў у бліжэйшыя дні **А** так / **В** не / **С** не цалкам

10.7. - прозвішчы суддзяў, прызначаных на справы **А** так / **В** не / **С** не цалкам

10.8. - у тым ліку прозвішчы суддзяў, прызначаных на адміністратыўныя справы **А** так / **В** не / **С** не цалкам

10.9. - змест, артыкулы альбо назвы адміністратыўных спраў, што будуць разглядацца **А** так / **В** не / **С** не цалкам

10.10. - парадак падачы скаргаў і заяў **А** так / **В** не / **С** не цалкам

10.11. - узоры заяў, скаргаў, іншых працэсуальных дакументаў **А** так / **В** не / **С** не цалкам

10.12. - парадак аплаты і памеры дзяржаўнай пошліны **А** так / **В** не / **С** не цалкам

10.13. - час прыёму грамадзянаў суддзямі **А** так / **В** не / **С** не цалкам

10.14. - расклад, правілы распарадку і паводзін у судзе **А** так / **В** не / **С** не цалкам

10.15. - кантакты адвакатаў альбо адрасы юрыдычных кансультацый **А** так / **В** не

11. ЦІ ПАВЕДАМЛЯЕ КАНЦЫЛЯРЫЯ (САКРАТАРЫЯТ) СУДА ІНФАРМАЦЫЮ ПРА АДМІНІСТРАТЫЎНЫЯ ПРАЦЭСЫ ЖУРНАЛІСТАМ І ІНШАЙ ПУБЛІЦЫ? **А** так / **В** не / **С** не цалкам

12. ЦІ АБВЯШЧАЕЦЦА Ў СУДЗЕ ПРА ПАЧАТАК ПРАЦЭСУ НЕПАСРЭДНА ПЕРАД ПАЧАТКАМ ПРАЦЭСУ? **А** так / **В** не

13. ІНШЫЯ ЗАЎВАГІ АДНОСНА МАГЧЫМАСЦЯЎ АТРЫМАННЯ ІНФАРМАЦЫІ ____________________________
________________________________________________________________________________________

14. ЦІ ІСНУЮЦЬ АБМЕЖАВАННІ Ў ДОСТУПЕ Ў ПАКОЙ, ДЗЕ АДБЫВАЕЦЦА СУДОВЫ ПРАЦЭС? **А** не / **В** так, існуюць наступныя абмежаванні ______________________________________________________ / **С** у тым ліку абмежаваны доступ да разгляду спраў пры адсутнасці правапарушальніка____________________________________

ЦІ ЁСЦЬ У ПАКОЯХ СУДДЗІ АЛЬБО Ў ЗАЛАХ СУДОВЫХ ПАСЯДЖЭННЯЎ:
15.1. - камп’ютэр **A** так / **B** не
15.2. - тэлефон **A** так / **B** не
15.3. - сродкі аўдыёзапісу альбо відэазапісу **A** так / **B** не
15.4. - трыбуна для выступоўцаў **A** так / **B** не
15.5. - дзяржаўны герб і дзяржаўны сцяг **A** так / **B** не
15.6. - сталы альбо зручныя месцы для прадстаўнікоў бакоў **A** так / **B** не
15.7. - іншае абсталяванне ______________________________________________________________
16. АПІШЫЦЕ АБСТАЛЯВАННЕ САКРАТАРОЎ АЛЬБО МЕТОДЫКУ ВЯДЗЕННЯ ЗАПІСУ ____________________
__________________________________________________________________________________________
17. СВЕДКІ ЧАКАЮЦЬ ДОПЫТУ ПАДЧАС СУДОВАГА ПАСЯДЖЭННЯ
**A** у спецыяльным альбо прыстасаваным пакоі / **B** на калідоры, стоячы перад пакоем суддзі / **C** на калідоры перад пакоем суддзі на месцах для сядзення / **D** у залі, дзе адбываецца пасяджэнне / **E** на лесвіцы альбо ў фае
ЗАЎВАГІ АДНОСНА ЎМОЎ ДЛЯ СВЕДКАЎ _________________________________________________________
__________________________________________________________________________________________

АПІШЫЦЕ АКУСТЫЧНЫЯ ЯКАСЦІ ПАКОЯЎ, ДЗЕ АДБЫВАЮЦЦА СУДОВЫЯ ПАСЯДЖЭННІ
17.1. - вельмі шумна, не чуваць выступоўцаў **A** заўсёды / **B** часта / **C** зрэдку / **D** ніколі
17.2. - не вельмі шумна, але чуваць галасы і шум з калідора і іншых пакояў — **A** заўсёды / **B** часта / **C** зрэдку / **D** ніколі
17.3. - ціха, нішто не перашкаджае **A** заўсёды / **B** часта / **C** зрэдку / **D** ніколі

18. ЦІ ЁСЦЬ СПЕЦЫЯЛЬНА ВЫЗНАЧАНЫЯ СУДДЗІ, ЯКІЯ РАЗГЛЯДАЮЦЬ СПРАВЫ АБ АДМІНІСТРАТЫЎНЫХ ПРАВАПАРУШЭННЯХ? **A** так, адміністратыўныя справы разглядаюць _____ спецыяльных суддзяў / **B** не, адміністратыўныя справы разглядаюць розныя суддзі ў колькасці _____ чалавек
19. ЦІ ЁСЦЬ СУДДЗІ ПА АДМІНІСТРАТЫЎНЫХ СПРАВАХ, ЯКІЯ РАЗГЛЯДАЮЦЬ СПРАВЫ ПА-ЗА АСНОЎНЫМ БУДЫНКАМ СУДА? **A** не / **B** так, ____________________________________________________
__________________________________________________________________________________________
_________________________________________________________________________ *(апішыце іх дзейнасць)*

20. ІНШЫЯ ЗАЎВАГІ АДНОСНА МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАГА СТАНУ СУДА ________________

_______________________________________________________________________________________________

__________________________________________________________________________

21. ЗА ЧАС АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ НАЗІРАННЯ Ў МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНЫМ ЗАБЕСПЯЧЭННІ СУДА АДБЫЛІСЯ НАСТУПНЫЯ ЗМЕНЫ ________________________________________________________________

_______________________________________________________________________________________________

22. УСЯГО, ПА ЗВЕСТКАХ НАЗІРАЛЬНІКА, У СУДЗЕ БЫЛІ РАЗГЛЕДЖАНЫ _____ АДМІНІСТРАТЫЎНЫЯ СПРАВЫ, З ІХ АЖЫЦЦЯЎЛЯЛАСЯ НЕПАСРЭДНАЕ НАЗІРАННЕ ЗА _____ ПРАЦЭСАМІ.

У ТЫМ ЛІКУ СУДДЗЯ ___________________ РАЗГЛЕДЗЕЎ ___ СПРАЎ, З ІХ НАЗІРАЛІ ЗА ___ ПРАЦЭСАМІ
У ТЫМ ЛІКУ СУДДЗЯ ___________________ РАЗГЛЕДЗЕЎ ___ СПРАЎ, З ІХ НАЗІРАЛІ ЗА ___ ПРАЦЭСАМІ
У ТЫМ ЛІКУ СУДДЗЯ ___________________ РАЗГЛЕДЗЕЎ ___ СПРАЎ, З ІХ НАЗІРАЛІ ЗА ___ ПРАЦЭСАМІ
У ТЫМ ЛІКУ СУДДЗЯ ___________________ РАЗГЛЕДЗЕЎ ___ СПРАЎ, З ІХ НАЗІРАЛІ ЗА ___ ПРАЦЭСАМІ

KAMUNIKAT.org

***Парадак запаўнення агульнага ліста назірання (вытрымкі з інструкцыі назіральнікам)***

*Кожны назіральнік павінен у ходзе назірання пазначаць звесткі, што патрабуюцца для запаўнення агульнага ліста назірання за матэрыяльна-тэхнічным станам суда (нягледзячы на назву, звесткі, атрыманыя па гэтых лістах назірання, будуць сведчыць пра даступнасць і адкрытасць судовых працэсаў у дадзеным судзе). Назіральнік запісвае толькі тыя звесткі, якія ён сам зафіксаваў у тым судзе, у якім ён праводзіць назіранне.*

*Адзін назіральнік запаўняе адзін агульны ліст назірання напрыканцы праграмы маніторынгу («адзін назіральнік — азін агульны ліст назірання»).*

*Пасля кожны назіральнік здае каардынатару адзін асобнік запоўненага агульнага ліста назірання. Каардынатар па выніках аналізу дадзеных дакументаў і па выніках размоў з назіральнікамі выпрацоўвае адзіны канчатковы варыянт агульнага ліста назірання ў дачыненні да кожнага з паднаглядных судоў (па прынцыпу «адзін суд — адзін агульны ліст назірання»). Пасля гэтыя агульныя лісты назірання перадаюцца ў Мінск для аналізу і апрацоўкі.*

# 4. ДАДЗЕНЫЯ, АТРЫМАНЫЯ Ў ВЫНІКУ ДАСЛЕДАВАННЯ ВЫКАНАННЯ ПРАВА НА СПРАВЯДЛІВЫ СУД ПАДЧАС РАЗГЛЯДУ СПРАЎ АБ АДМІНІСТРАТЫЎНЫХ ПРАВАПАРУШЭННЯХ

Час маніторынгу — з 22.03.2004 да 02.04.2004

## РАЗГЛЯД СПРАЎ АБ АДМІНІСТРАТЫЎНЫХ ПРАВАПАРУШЭННЯХ

*Табліца № 1*

***Горад, дзе адбываўся разгляд справы***
*(Пытанне № 1)*

| | **Колькасць спраў** | **Працэнт** |
|---|---|---|
| Мінск | 260 | 48,78 |
| Віцебск | 72 | 13,51 |
| Брэст | 102 | 19,14 |
| Наваполацк | 51 | 9,57 |
| Полацк | 48 | 9,01 |
| **Агулам** | **533** | **100** |

*Табліца № 2*

***Горад і назва суда***
*(Пытанне № 1)*

| | **Колькасць** | **Працэнт** |
|---|---|---|
| Мінск, Першамайскі раённы | 21 | 3,94 |
| Мінск, Савецкі раённы | 42 | 7,88 |
| Мінск, Заводскі раённы | 58 | 10,88 |
| Мінск, Цэнтральны раённы | 51 | 9,57 |
| Мінск, Ленінскі раённы | 88 | 16,51 |
| **Усяго па Мінску** | **260** | **48,78** |
| Віцебск, Чыгуначны раённы | 28 | 5,25 |
| Віцебск, суд Віцебскага раёна | 42 | 7,88 |
| Віцебск, Кастрычніцкі раённы | 2 | 0,38 |
| **Усяго па Віцебску** | **72** | **13,51** |
| Брэст, Маскоўскі раённы | 53 | 9,94 |
| Брэст, Ленінскі раённы | 49 | 9,19 |
| **Усяго па Брэсту** | **102** | **19,14** |
| **Наваполацк,** Гарадскі | 51 | 9,57 |
| **Полацк,** суд горада Полацка і Полацкага раёна | 48 | 9,01 |

*Табліца № 3*

## *Дата пачатку працэсу*

*(Пытанне № 2)*

| | **Колькасць** | **Працэнт** |
|---|---|---|
| 20.02.2004 | 1 | 0,19 |
| 29.02.2004 | 1 | 0,19 |
| 01.03.2004 | 1 | 0,19 |
| 02.03.2004 | 1 | 0,19 |
| 11.03.2004 | 1 | 0,19 |
| 12.03.2004 | 1 | 0,19 |
| 19.03.2004 | 1 | 0,19 |
| 22.03.2004 | 51 | 9,57 |
| 23.03.2004 | 61 | 11,44 |
| 24.03.2004 | 54 | 10,13 |
| 25.03.2004 | 59 | 11,07 |
| 26.03.2004 | 47 | 8,82 |
| 29.03.2004 | 56 | 10,51 |
| 30.03.2004 | 61 | 11,44 |
| 31.03.2004 | 48 | 9,01 |
| 01.04.2004 | 32 | 6 |
| 02.04.2004 | 51 | 9,58 |
| **Няма адказу** | **6** | **1,13** |

*Табліца № 4*

## *Ці былі пераносы разгляду справы?*

*(Пытанне № 3)*

| | **Колькасць** | **Працэнт** |
|---|---|---|
| Не | 455 | 85,37 |
| Так | 63 | 11,82 |
| **Няма адказу** | **15** | **2,81** |

*Табліца № 5*

## *Месца разгляду справы*

*(Пытанне № 4)*

| | **Колькасць** | **Працэнт** |
|---|---|---|
| Кабінет суддзі | 395 | 74,11 |
| Судовая зала | 26 | 4,88 |
| Міліцыя (ГАМ, РАУС і г. д.) | 103 | 19,32 |
| Іншае | 1 | 0,19 |
| **Няма адказу** | **8** | **1,5** |

*Табліца № 6*

**_Прыкладная колькасць месцаў для публікі_**

*(Пытанне № 5)*

| | Колькасць | Працэнт |
|---|---|---|
| **0** | 32 | 6 |
| **1** | 13 | 2,44 |
| **2** | 164 | 30,77 |
| **3** | 31 | 5,82 |
| **4** | 68 | 12,76 |
| **5** | 39 | 7,32 |
| **6** | 69 | 12,95 |
| **7** | 57 | 10,69 |
| **8** | 18 | 3,38 |
| **10** | 15 | 2,81 |
| **11** | 5 | 0,94 |
| **12** | 1 | 0,19 |
| **15** | 6 | 1,13 |
| **20** | 1 | 0,19 |
| **50** | 5 | 0,94 |
| **Няма адказу** | 9 | 1,69 |

*Табліца № 7*

**_Ці было ў судзе абвешчана пра пачатак працэсу?_**

*(Пытанне № 6)*

| | Колькасць | Працэнт |
|---|---|---|
| **Не** | **331** | **62,1** |
| **Так (усяго)** | **189** | **35,46** |
| У тым ліку «так, без каментарыя» | 89 | 16,7 |
| У тым ліку «так, паведамілі вусна» | 39 | 7,32 |
| У тым ліку «так, паведамілі пісьмова» | 61 | 11,44 |
| **Няма адказу** | **13** | **2,44** |

*Табліца № 8*

**_Ці была затрымка пачатку працэсу?_**

*(Пытанне № 7)*

| | Колькасць | Працэнт |
|---|---|---|
| Не | 382 | 71,67 |
| Так | 76 | 14,26 |
| **Няма адказу** | **75** | **14,07** |

Табліца № 9

**_Працэс быў затрыманы на..._**

_(Пытанне № 7)_

| | Колькасць | Працэнт |
|---|---|---|
| Да 15 хвілін | 27 | 5,07 |
| 16–30 хвілін | 18 | 3,38 |
| 31–60 хвілін | 6 | 1,13 |
| Болей за гадзіну | 6 | 1,13 |
| **Няма адказу** | **476** | **89,31** |

Табліца № 10

**_Верагодная прычына затрымкі працэсу_**

_(Пытанне № 7)_

| | Колькасць | Працэнт |
|---|---|---|
| Па віне правапарушальніка | 35 | 6,57 |
| Па віне суддзі альбо сакратара | 19 | 3,56 |
| З-за разгляду іншай справы | 13 | 2,44 |
| Невядома | 3 | 0,56 |
| **Няма адказу** | **463** | **86,87** |

Табліца № 11

**_Ці быў абвешчаны склад суда?_**

_(Пытанне № 8)_

